Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся!

# ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і Мен. Гаркому Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

ГОД ВЫДАННЯ—XV
№ 227 (4132)
СУБОТА 22 жніўня
1931 г.
Выходзіць
БЕСЬПЕРАПЫННА.

# АБ РАЗГОРТВАНЬНІ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ ЖЫВЕЛАГАДОЎЛІ

## Усім партыйным, савецкім, гаспадарчым, зямельным і калгасным арганізацыям БССР

Цэнтральны Камітэт КП(б)Б і Савет Народных Камісараў БССР адзначаюць, што, ня гледзячы на кароткі тэрмін свайго існаваньня, аграмаджаная жывёлагадоўля (саўгасныя і калгасныя таварныя фэрмы) ужо складае значнае стада (буйной рагатай жывёлы ў жывёлагадоўчых саўгасах 42.000 штук, сьвіней—52.000 штук, у калгасна-таварных фэрмах буйной рагатай жывёлы—85.000 шт. з іх кароў—52.000 шт., сьвіней—71.000 штук, з іх сьвіноматак—41.000 штук) і заняла значнае месца ў вырабе малочнай прадукцыі (на 1-га жніўня жывёлагадоўчымі саўгасамі і малочна-калгаснымі таварнымі фэрмамі адана (прадана) дзяржаве 253,140 цэнт. малака). Таварнасьць жывёлагадоўчых таварных фэрм і саўгасаў складае каля 65 проц.

Аднак, дасягнутыя посьпехі ў галіне разгортваньня жывёлагадоўлі ў саўгасах і жывёлагадоўчых калгасна-таварных фэрмах ЦК КП(б)Б і Савет Народных Камісараў БССР лічаць зусім недастатковымі і незабясьпечваючымі выкананьне пастаўленых задач XVI зьезду УсеКП(б) і XIII зьезду КП(б)Б.

Раённыя партыйныя арганізацыі, раённыя выканаўчыя камітэты, дырэктары саўгасаў і кіраўнікі калгасаў не паставілі ў цэнтры ўвагі сваёй работы жывёлагадоўлю, у выніку чаго не дабіліся: стварэньня кармовай базы, як асновы для разгортваньня жывёлагадоўлі; дрэнна пастаўлен догляд і не захаваны санітарныя ўмовы ўтрыманьня жывёлы, безгаспадарчасьць у значнай частцы саўгасаў і калгасаў, недапушчальна высокі процант упадку жывёлы, галоўным чынам, сьвіней, адставаньне ва ўкамплектаваньні стада як за кошт аграмаджаньня па лініі малочных і сьвінагадоўчых таварных фэрм, так і па лініі ўкамплектаваньня Саюзмяса за лік загатовак; абсалютна незадавальняючае выкананьне праграмы будаўніцтва па жывёлагадоўлі.

Усе гэтыя моманты зьяўляюцца тормазам у выкананьні прынятай ЦК і Саўнаркомам праграмы разгортваньня жывёлагадоўлі ў сацыялістычным сэктары сельскай гаспадаркі.

Выходзячы з гэтага, Цэнтральны Камітэт КП(б)Б і Савет Народных Камісараў БССР у выкананьне пастановы ЦК УсеКП(б) і Савету Народных Камісараў СССР пастанаўляюць:

### 1.

Паставіць задачу стварэньня і ўзмацненьня сацыялістычнага сэктару ў галіне жывёлагадоўлі ў саўгасах і калгасна-таварных фэрмах цэнтральнай задачай усёй КП(б)Б.

ЦК КП(б)Б і Саўнарком БССР абавязваюць усе РК КП(б)Б, райвыканкомы, трэсты і цэнтры калгасных таварных фэрм прыняць усе меры да таго, каб у 1931 годзе забясьпечыць цьвёрды падмурак для далейшага шпаркага разьвіцьця сацыялістычнага сэктару жывёлагадоўлі з тым, каб і ў гэтай галіне пакуль яшчэ слаба аграмаджанай галіне сельска-гаспадарчай вытворчасьці дабіцца сапраўднай перамогі, арганізаванай, мэханізаванай, заснаванай на апошніх дасягненьнях навукі, гаспадаркі.

1931-32 г. г. па стварэньні жывёлагадоўчых саўгасаў і калгасна-таварных фэрм, «павінны быць гадамі такога-ж рашучага пералому ў разгортваньні жывёлагадоўлі, якімі былі 1929-30 гады ў справе арганізацыі сацыялістычнай збожжавай гаспадаркі». (З адозвы ЦК УсеКП(б) і СНК СССР).

### 2.

Давесьці агульнае стада ўсіх відаў жывёлы да канца 1931 г. і 1932 г.:

| | 1931 г. | 1932 г. |
|---|---|---|
| **УСЯГО КОНЯЙ** | 1.019.000 | 1.039.000 |
| З іх: | | |
| а) Рабочых коняй | 754.000 | 754.000 |
| б) маладняка ад 2 да 4 г. | 127.000 | 127.000 |
| в) маладняка ад 1 да 2 год | 62.000 | 62.000 |
| г) маладняка да 1 году | 76.000 | 96.000 |
| **УСЯГО БУЙНОЙ РАГАТАЙ ЖЫВЕЛЫ:** | 1.942.000 | 2.322.000 |
| З іх: | | |
| а) Кароў | 1.200.000 | 1.204.000 |
| б) Нецеляў ад 2 да 3 г. | 92.000 | 148.000 |
| в) Маладняка ад 1 да 2 г. | 200.000 | 350.000 |
| г) Цялят | 450.000 | 500.000 |
| **УСЯГО СЬВІНЕЙ** | 2.710.000 | 3.800.000 |
| З іх: | | |
| а) Сьвіней старэй 9 мес. | 887.000 | 1.100.000 |
| б) Падсьвінкаў ад 4 да 9 мес. | 833.000 | 1.550.000 |
| в) Парасят да 4 мес. | 1.000.000 | 1.150.000 |
| **ДРОБНАЙ ЖЫВЕЛЫ:** | | |
| а) Авец і коз | 2.746.000 | 2.746.000 |
| б) птушак | 3.500.000 | 5.000.000 |
| в) трусоў | 50.000 | 150.000 |

### 3.

Давесьці агульнае стада жывёлагадоўчых саўгасаў і калгасных таварных фэрм да канца 1931 і 1932 г.

| НАЗВА АБ'ЯДНАНЬНЯЎ | Агульнае стада ў 1931 г. (у тыс. штук): Усяго буйной раг. жывёлы | З іх кароў | Усяго сьвіней | З іх сьвіноматак | Птушак мяса | Трусоў мяса | Агульнае стада ў 1932 г. (у тыс. штук): Усяго буйн. раг. жывёлы | З іх кароў | Усяго сьвіней | З іх сьвіноматак | Птушак мяса | Трусоў мяса |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Белсаўгастрэст | 38 | 20 | — | — | 34 | 12 | 52 | 27 | — | — | 85 | 25 |
| Маслатрэст | 6,45 | 4,20 | — | — | — | — | 15 | 10 | — | — | — | — |
| Сельгасаб'яднаньне (Белкаапсаюз) | 45 | 12 | 35 | 6 | — | — | 21 | 15 | 90 | 14 | — | — |
| Сьвінаводтрэст | 16,26 | 8 | 175 | 50 | — | — | 20 | 12 | 375 | 75 | — | — |
| Інш. саўгас. сыстэмы | 10 | 4,85 | — | — | — | — | 16 | 8 | — | — | — | — |
| Малакокалгасцэнтр | 150 | 78 | — | — | — | — | 300 | 150 | — | — | — | — |
| Сьвінаводкалгасцэнтр | — | — | 300 | 100 | — | — | — | — | 920 | 300 | — | — |
| Птушкакалгасцэнтр | — | — | — | — | 141 | 20 | — | — | — | — | 560 | 60 |
| Птушкасындыкат | — | — | — | — | — | 8 | — | — | — | — | — | 10 |
| Птушкапрадукт | — | — | — | — | 22 | — | — | — | — | — | 140 | — |

### 4.

Абавязаць Наркамснаб, Наркамзем, саўгастрэсты і цэнтры калгасных таварных фэрм правесьці за лік загатовак камплектаваньне стада жывёлагадоўчых саўгасаў і калгасных таварных фэрм да канца 1931 і 1932 году

| НАЗВА АБ'ЯДНАНЬНЯЎ | План камплектаваньня 1931 г.: Кароў | Нецеляў | Сьвіноматак | Птушак | План камплектаваньня 1932 г.: Кароў | Нецеляў | Сьвіноматак | Птушак |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Белсаўгастрэст | 7000 | — | — | 3500 | 9500 | — | — | 10.000 |
| Маслатрэст | 2700 | 1550 | — | — | 5800 | 2000 | — | — |
| Сельгасаб'яднаньне (Белкаапсаюз) | 6000 | — | — | — | 3400 | — | — | — |
| Сьвінаводтрэст | 3000 | — | 25000 | — | 4000 | — | 10.000 | — |
| Інш. саўгас. сыстэмы | 1000 | — | — | — | 2500 | — | — | — |
| Малакокалгасцэнтр | 23000 | — | — | — | 40000 | — | — | — |
| Сьвінаводкалгасцэнтр | — | — | 57000 | — | — | — | 75.000 | — |
| Птушкакалгасцэнтр | — | — | — | 80000 | — | — | — | 95,000 |

**Увага:** З наменчанага пляну за лік загатовак унутры калгасаў павінна быць набыта ў 1931 г.—45.000 штук сьвіноматак і ў 1932 г.—75.000 штук сьвіноматак, 40.000 штук кароў.

### 5.

Абавязаць калгасцэнтр правесьці выпрошчваньне цялят на лініі калгасаў да канца 1931 году—265.000 штук цялят, у тым ліку за лік выпрошчваньня ад аграмаджаных кароў 83.000 штук цялят, за лік закупак у калгасьніцкіх і дадатковага аграмаджаньня 98.000 штук цялят і за лік перадачы Белмясам ад загатовак 84.000 штук цялят. Наркамзему і Калгасцэнтру арганізаваць выпрошчваньне маладняка цялят шляхам арганізацыі ня менш 700 фэрм да канца гэтага году з тым, каб гэтыя фэрмы потым перараслі ў малочна-таварныя калгасныя фэрмы.

Абавязаць саўгастрэсты і цэнтры калгасна-таварных фэрм здаць (прадаць) дзяржаве да канца 1931-32 году прадукцыі:

### 6.

| НАЗВА АБ'ЯДНАНЬНЯЎ | 1931 г.: Малака ў цэнт. | Мяса ў цэнт. | Яек ў цэнт. | 1932 г.: Малака ў цэнт. | Мяса ў цэнт. | Яек ў цэнт. |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Белсаўгастрэст | 75000 | 750 | — | 250000 | 7600 | 545 |
| Маслатрэст | 23000 | — | — | 90000 | — | — |
| Сельгасаб'яднаньне (БКС) | 150000 | 1000 | — | 200000 | 10000 | — |
| Сьвінаводтрэст | 13000 | 26000 | — | 20000 | 210000 | — |
| Інш. саўгас. сыстэмы | 25000 | — | — | 50000 | 2500 | — |
| Малакокалгасцэнтр | 350000 | — | — | 860000 | — | — |
| Сьвінаводкалгасцэнтр | — | 26500 | — | — | 210000 | — |
| Птушкакалгасцэнтр | — | — | — | — | 3500 | 2150 |
| Птушкапрадукт | — | — | — | — | 810 | 700 |

### 7.

У мэтах выкананьня пляну па разьвіцьці жывёлагадоўлі ў саўгасах і калгасных таварных фэрмах даручыць НКЗему і Калгасцэнтру правесьці:

а) узбуйненьне існуючых і арганізацыю новых саўгасаў, давядзеньне калгасных таварных фэрм да канца 1932 году: малочных да 1.500 фэрм, сьвінагадоўчых — да 3.000 фэрм, птушніцкіх— да 305 фэрм, трусагадоўчых — да 30 фэрм, кановодчых — да 77 фэрм і інкубатарна - птушніцкіх станцый — да 6 станцый;

б) заданьне на 1932 г. па арганізацыі прамыслова - жывёлагадоўчых саўгасаў і калгасных таварных фэрм давесьці да раёнаў у дэкадны тэрмін, а раёнам давесьці да саўгасаў у 2-дэкадны тэрмін і калгасных таварных фэрм на працягу месячнага тэрміну.

### 8.

У мэтах якаснага паляпшэньня жывёлы правесьці да канца 1932 г. мерапрыемствы па племянной справе:

а) па буйной рагатай жывёле — 11 племсаўгасаў і 20 племкалгасаў, па сьвіньнях — 11 саўгасаў і 22 калгасы, па конях — 3 саўгасы і 30 калгасаў, па птушках—5 саўгасаў;

б) давесьці стада гэтых племгасаў да канца 1932 г.: па буйной раг. жывёле ў саўгасах да 7.000 штук, у калгасах—да 7.000 штук, па сьвіньнях у саўгасах—да 2.500 штук матак, па конях у саўгасах—да 400 штук матак і ў калгасах — да 1.000 штук матак, па птушках у саўгасах—да 10.000 штук;

в) укамплектаваньне ўсіх племгасаў правесьці за лік паляўнага паголоўя племянной жывёлы ў саўгасах і калгасах распублікі, дзеля чаго прапанаваць НКЗему, саўгастрэстам і Калгасцэнтру зрабіць перакідку гэтай жывёлы як шляхам абмену яе на беспародную, так і шляхам закупкі.

### 9.

Абавязаць райкомы КП(б)Б, райвыканкомы і зямельныя органы аказаць усялякую дапамогу ва ўкамплектаваньні стада калгасных, жывёлагадоўчых таварных фэрм як шляхам вылучэньня для гэтых фэрм з існуючых калгасаў часткі аграмаджанай жывёлы, а таксама шляхам аграмаджаньня і куплі ў калгасьнікаў жывёлы для фармаваньня стада тварных фэрм (кароў, сьвіней і ў асаблівасьці цялят і парасят).

### 10.

Абавязаць Калгасцэнтр паставіць задачу порад калгасамі, якія ня маюць сьвінагадоўчых, малочных і птушніцка-таварных фэрм, арганізаваць у кожным калгасе калектыўнае вырошчваньне і калектыўны продаж дзяржаве ад 10 да 50 сьвіней, ад 100 да 500 штук птушак, а таксама здачу малочнай прадукцыі ад 30 да 50 проц. выхаду малака ад аграмаджанага стада, прапанаваўшы Белкаапсаюзу паставіць такую-ж задачу перад сельскімі спажыв.-таварыствамі, Наркамснабу і Наркамзему распрацаваць меры заахвочваньня ў выкананьні гэтай задачы.

### 11.

У зьвязку з тым, што сьвінагадоўля ў БССР пры наяўнасьці спрыяючых умоў мае вялікія магчымасьці для свайго разгортваньня і найбольш шпаркім тэмпам вырашае пытаньне аб забясьпечаньні мясам рабочых, прапанаваць РК КП(б)Б, райвыканкомам, каапэрацыйным і калгасным арганізацыям узяць пад асаблівы нагляд выкананьне раённых плянаў па ўкамплектаваньні і вырошчваньні сьвіней, забясьпечыўшы ў кожным раёне выкананьне пляну на будаўніцтве, зьвярнуўшы асаблівую ўвагу на барацьбу з эпізастыяй і выкананьні ўсімі саўгаснымі і калгасна-таварнымі фэрмамі зоамінімуму. Узмацніць канкрэтнае кіраўніцтва сьвінагадоўчымі саўгасамі і калгаснымі таварнымі фэрмамі.

### 12.

Улічваючы значную ролю ў справе забясьпячэньня мясам разьвіцьця дробнай жывёлагадоўлі (птушак, трусоў), ЦК і СНК БССР прапануюць усім райкомам КП(б)Б, райвыканкомам, зямельным і калгасным арганізацыям зьвярнуць асаблівую ўвагу на разьвіцьцё гэтых скарасьпелых галін жывёлагадоўлі.

### 13.

Прапанаваць НКСнабу БССР праводзіць задачу загатоўленай жывёлы саўгасам і калгасным таварным фэрмам непасрэдна з першапачатковых загатоўчых пунктаў з тым, каб загатоўленая жывёла накіроўвалася ў агульныя гурты і па забой толькі пасьля агляду гэтай жывёлы і адбору для вытворчых мэт, устанавіўшы тэрмін для адбору жывёлы загатоўчых пунктаў прыёмпунктамі жывёлагадоўчых саўгасаў ад 5 да 8 дзён, забясьпечыўшы пры гэтым выкананьне ўстаноўленай законам забароны забою племянных кароў і вытворнікаў, прыцягваючы вінаватых у парушэньні гэтага да самай суровай адказнасьці.

Саўгастрэстам прымаць перададаную загатоўчымі базамі племянную жывёлу для камплектаваньня стада саўгасаў ва ўсіх без выключэньня раёнах незалежна ад плянаў камплектаваньня данага раёну.

### 14.

Адзначаючы ненармальна вялікі ўпадак жывёлы, у асаблівасьці маладняка ў жывёлагадоўчых саўгасах і калгасах, ЦК КП(б)Б і СНК БССР прапануюць жывёлагадоўчым трэстам, цэнтрам калгасных таварных фэрм, зямельным органам і калгасаюзам, дырэктарам саўгасаў, вэтэрэманалу і кіраўнікам калгасных таварных фэрм прыняць меры да рашучага паляпшэньня догляду жывёлы, зьніжэньне процанту адыходу ад рознага роду хвароб, барацьбы з безгаспадарчасьцю і нездавальняючым утрыманьнем жывёлы, забясьпечыўшы ў бліжэйшы год рашучае павялічэньне тэмпаў прыросту стада саўгасаў і калгасаў, арганізуючы барацьбу за кожную галаву жывёлы, асабліва сьвіней і кароў.

### 15.

Для забясьпячэньня выкананьня пляну здачы таварнай прадукцыі жывёлагадоўчымі саўгасамі і калгасна-таварнымі фэрмамі абавязаць:

а) Наркамзем, Калгасцэнтр, райкомы КП(б)Б і райвыканкомы забясьпечыць яшчэ больш кантроль за ходам здачы таварнае прадукцыі саўгасамі і калгаснымі таварнымі фэрмамі, няўхільна прыцягваючы дырэктароў саўгасаў і кіраўнікоў калгасных таварных фэрм, вінаватых у разбазараваньні таварнай прадукцыі, да суровай адказнасьці, як за раскрадваньне народнай маемасьці;

б) Наркамзему ўстанавіць спэцыяльныя прэміі за перавыкананьне плянаў здачы таварнай прадукцыі (зьніжэньне процанту адыходу, павялічэньне прадукцыйнасьці) паасобнымі саўгасамі і калгаснымі таварнымі фэрмамі як у форме грашовай, натуральных выдач дырэктарам, рабочым, спэцыялістам жывёлагадоўчых саўгасаў і калгасных таварных фэрм, так і ў форме прэміраваньня саўгасаў і таварных фэрм у поўным шляхам водпуску звыш пляну трактараў, машын, канцэнтраваных кармоў, племянных вытворнікаў і г. д., выдзеліўшы ў 1931 годзе 100.000 руб. і шадугледзіўшы на 1932 год 500.000 руб. пром. фонд.

в) забясьпечыць у адносінах усіх без выключэньня спэцыялістаў, вышэйшага адміністрацыйнага пэрсаналу і старшых рабочых саўгасаў правядзеньне сыстэмы павышэньня заработнай платы гэтых катэгорый работнікаў у адпаведнасьці з размерамі вытворчасьці і здачы таварнай прадукцыі.

### 16.

Адзначаючы, што стварэньне пастаяннай кармовай базы зьяўляецца рашаючай умовай пасьпяховага разгортваньня жывёлагадоўчых саўгасаў і калгасных таварных фэрм, ЦК і СНК БССР прапануюць усім райкомам КП(б)Б, райвыканкомам, саўгастрэстам, зямельным і калгасным органам забясьпечыць выкананьне пастановы Савету Народных Камісараў ад 15-га ліпеня 1931 г. аб стварэньні кармовай базы.

### 17.

Прапанаваць Наркамснабу і Наркамзему БССР устанавіць парадак водпуску канцэнтраваных кармоў для пакрыцьця дэфіцыту жывёлагадоўчых саўгасаў і калгасных таварных фэрм у залежнасьці ад здачы таварнай прадукцыі і праект мерапрыемстваў па гэтым пытаньні падаць на зацьверджаньне Эканамічнага Савету.

### 18.

Для ўзмацненьня дзяржаўных рэсурсаў канцэнтраваных кармоў прызнаць неабходным шырокае разгортваньне перапрацоўкі на кармы адыходаў харчовай і броварнай прамысловасьці па лініі Белсельтрэсту 130.000 цэнтр. па Белдзяржсыпроце — 150.000 цэнт., па Белсельпрамаб'яднаньні — 70.000 цэнтр., Наркамснабе і НКЗеме ў дэкадны тэрмін скласьці і прадставіць у Эканамічны Савет Надрабязны план разгортваньня гэтай прамысловасьці ў другой палове 1931 г і ў 1932 г.

### 19.

Побач з разгортваньнем камбікормавай прамысловасьці ў сыстэме НКСнаб арганізаваць у сыстэме НКЗему Беларускае аддзяленьне трэсту «Камбікормсаюзу» для будаўніцтва заводаў і арганізацыі вырабу камбікормаў. Прапанаваць ВСНГ у месячны тэрмін распрацаваць і ўнесьці на разгляд Эканамічнага Савету практычныя прапановы па вырабе абсталяваньня для камбікормавай прамысловасьці, забясьпечыўшы ўжо гэтым годзе выпуск 3-х тысяч штук кормазапарнікаў і 1.000 жмыхадрабілак.

### 20.

Адзначаючы абсалютна незадавальняючы ход сілазаваньня кармоў, абавязаць райкомы КП(б)Б, райвыканкомы, саўгастрэсты і Калгасцэнтр забясьпечыць выкананьне намечанага пляну ЦК і СНК БССР у 1.000.000 тон сіласных кормаў, прапанаваўшы ВСНГ наладзіць забясьпячэньне матар'ялам сіласнай будаўніцтва, арганізаваўшы ў сыстэме Белсельбуду аддзяленьне ўсесаюзнай канторы па сіласным будаўніцтве.

### 21.

У мэтах забясьпячэньня прамысловае жывёлагадоўчых саўгасаў і калгасных таварных фэрм вадой арганізаваць у складзе НКЗему БССР рэспубліканскі трэст па водаспаджэньні, даручыўшы Эканамічнаму Савету распрацаваць формы вырабу і забясьпячэньня жывёлагадоўчых саўгасаў і калгасных таварных фэрм торфанадсьцілам.

### 22.

Адзначаючы зусім незадавальняючае выкананьне пляну капітальнага будаўніцтва ў жывёлагадоўчых саўгасах і калгасных таварных фэрмах, абавязаць:

а) райкомы КП(б)Б, райвыканкомы, саўгастрэсты, Калгасцэнтр і Наркамзем забясьпечыць заварэньне будаўніцтва ў саўгасах і калгасах, неабходнага для разьмяшчэньня жывёлы, не пазьней 15-га лістапада 1931 г., усклаўшы спэцыяльны нагляд за ходам будаўніцтва і забясьпячэньня-будматар'ялам на парткома зямляробства тав. Рачыцкага, устанавіць рэгулярнае, ня менш 1 разу ў месяц заслухоўваньне на пасяджэньні ЦК дакладу аб ходзе будаўніцтва;

б) Белсельгасснабу, Белгасснабу, Беллесправу закончыць завоз будаўнічых матар'ялаў, асабліва лесаматар'ялаў і цьвікоў, адпушчаных жывёлагадоўчым саўгасам і калгасна-таварным фэрмам на першыя 3 кварталы, не пазьней 15 верасьня г. г.

в) саўгастрэстам і цэнтрам калгасных таварных фэрм пры выкананьні плянаў будаўніцтва ў жывёлагадоўчых саўгасах і калгасных таварных фэрмах забясьпечыць максімальную замену дэфіцытных будаўнічых матар'ялаў матар'ялямі мясцовага значэньня, выкінуўшы намечаную будаўнічую праграму.

### 23.

Прымаючы пад увагу, што разгортваньне буйной жывёлагадоўчай гаспадаркі ў гэтым годзе сустракае значныя перашкоды з-за недахвату малочнага інвэнтару для транспартаваньня малака, кармовых машын і сродкаў мэханізацыі, абавязаць Белсамтрамсаюз зараз-жа разгарнуць выраб гэтай пасуды ў неабходных разьмерах для забясьпячэньня дастаўкі малака на перапрацоўчыя і спажывецкія пункты.

### 24.

Для забясьпячэньня жывёлагадоўчых саўгасаў і калгасных таварных фэрм належнымі кадрамі кіруючых работнікаў і спэцыялістаў прапанаваць жывёлагадоўчым трэстам і Калгасцэнтру:

а) давесьці ў 1932 г. у кожным саўгасе лік спэцыялістаў вышэйшай кваліфікацыі ад 1 да 3 чалавек, сярэдняй — 3—6 чалавек і ў кожнай калгасна-таварнай фэрме — 1-2 чалавека як шляхам разгортваньня адпаведнай сеткі навучальных устаноў, так і шляхам падрыхтоўкі і перападрыхтоўкі праз курсавую сыстэму;

б) НКЗему забясьпечыць разгортваньне працы інстытутаў буйной раг. жывёлы і малочнай гаспадаркі, сьвінагадоўлі, вэтэрынарыі. Дзяржплану прыняць меры да пачарговага забясьпячэньня будаўніцтва вучэбнай інтэрнацкай плошчы будаўнічымі матар'ялямі.

в) НКЗему, Калгасцэнтру разгарнуць да існуючых жывёлагадоўчых тэхнікумаў яшчэ наступныя: Сьмілавіцкі — буйной раг. жывёлы і малочнай гаспадаркі, Расьнянскі — вэтэрынарны па лініі Малакокалгасцэнтру, Дрыбінскі — сьвінагадоўчы і Крупскі — вэтэрынарны па лініі Сьвінаводкалгасцэнтру Чэрвенскі — вэтэрынарны па лініі Белсельтрэсту, Вымянскі — птушкаводны і Пракопаўскі—трусаводны па лініі Белсаўгастрэсту;

г) арганізаваць у сыстэме жывёлагадоўчых трэстаў у калгасных цэнтрах шырокую сетку саўгас-калгасвучаў, кароткатэрміновых курсаў па падрыхтоўцы кваліфікаванай рабочай сілы (старэйшых скотнікаў, сьвінароў, даярак, птушкаводаў, вэтэрынарных фельчароў і г. д.), падрыхтаваўшы ў 1932 г. старэйшых сьвінароў 5.500 чалавек, малодшых сьвінароў — 15.000 чалавек, тэхнікаў — 800 чалавек, скотнікаў — 1.600 чалавек вэтфэльчароў — 1.100 чал., птушкаводаў — 600 чал., трусаводаў—300 чал., загадчыкаў фэрм — 4.200 чал., вэтсанітараў — 4.300 чал., кармавікоў —4.800 чал.;

д) аддзелу кадраў ЦК КП(б)Б у 2-х-дэкадны тэрмін узмацніць жывёлагадоўчыя трэсты і цэнтры калгасна-таварных фэрм працаўнікамі, а таксама перадаць неабходную колькасьць работнікаў для замяшчэньня пасад дырэктароў у новаарганізуемых саўгасах і ўзмацненьня існуючых.

### 25.

Адзначаючы абсалютна незадавальняючае вэтэрынарна-санітарнае становішча жывёлагадоўчых саўгасаў і таварна-калгасных фэрм, ЦК і СНК пастанаўляюць:

а) забясьпечыць найбольш поўнае скарыстаньне наяўнага вэтэрынарнага пэрсаналу.

б) саўгастрэстам і цэнтрам калгасных таварных фэрм забясьпечыць захаваньне ўсіх неабходных зоагігіенічных умоў утрыманьня жывёлы. Саюзмясу прапанаваць перавозку жывёлы ў адпаведнасьці з існуючымі вэтэрынарна-санітарнымі правіламі.

### 26.

Прапанаваць Эканомсавету разгледзець і зацьверадзіць плян фінансаваньня жывёлагадоўчых саўгасаў і калгасна-таварных фэрм на 4-ты квартал не пазьней 25-га жніўня г. г., а таксама пры праходжаньні плянаў на 1932 г. забясьпечыць фінансаваньне ў 1932 годзе жывёлагадоўчых саўгасаў і калгасаў і таварных фэрм.

### 27.

ЦК і СНК БССР зварачаюцца да ўсіх рабочых саўгасаў і калгасаў з заклікам разгарнуць шырокае сацыялістычнае спаборніцтва і ўдарніцтва па выкананьні гаспадарча-палітычнай задачы на разьвіцьці жывёлагадоўлі на падставе пастановы ЦК УсеКП(б) і СНК СССР і гэтай пастановы.

**Нам. старшыні СНК БССР БЭНЭК**

**Сакратар ЦК КП(б)Б ГЕЙ.**

# Генэральная праверка скончана, барацьба за высокія тэмпы ўборачнай працягваецца

Скончыўся месячнік генэральнай праверкі і самаправеркі ходу ўборкі ўраджаю і падрыхтоўкі да асеньняй сяўбы, які праводзіўся ЦКК НК-РСІ, НКЗ, Калгасцэнтрам БССР і «Зьвяздой».

Месячнік праверкі зьявіўся сродкам мабілізацыі калгасных і бядняцка-серадняцкіх аднаасобных мас вакол баявых задач уборачнай кампаніі, лепшай формай разгортваньня шырокай арганізацыйна-масавай работы, формай забясьпячэньня канкрэтнасьці і апэрацыйнасьці ў кіраўніцтве работай.

**Раённымі штабамі, сотнямі праверачных брыгад, якія стваралісь ў калгасах і саўгасах, прароблена вялікая практычная работа.**

Бясспрэчна, што праверка зьявілася магутным штурхачом у справе паскарэньня тэмпаў уборачнай, ушчольненьнем тэрмінаў асобных відаў палявых работ.

Там, дзе да праверкі адносьліся з належнай увагай, дзе была забясьпечана масавасьць, актыўны ўдзел у рабоце самаправерачных брыгад усяго низавога вясковага актыву, там мы маем зусім рэальныя вынікі, пасьпяховае выкананьне задач асеньняй сельска-гаспадарчай кампаніі.

Так, па-баявому справіліся з уборкай сонажацяй Койданаўскі і Бягомльскі раёны. Пасьпяхова і ў тэрмін скончыла жніво Рэчыца. Вельмі добрыя ўзоры работы паказалі калгасы «Ударнік», «Пераможца», Рагачоўскага раёну, калгасы імя Локіна, імя Калініна, Будзённага, Варашылава Брагінскага раёну, «Першамайскі»—Мазырскага раёну, камуны «Праца», «Энергія» (Ельскага раёну), «Чырвоны сьцяг» Гарадоцкага раёну, імя Сталіна—Сіроцінскага раёну, саўгасы «Стрэлічава», «Луцаўшчына» і г. д. Гэты сьпіс можна значна пашырыць. Аб гэтых героях уборкі другога бальшавіцкага ўраджаю намі друкаваліся дзесяткі кароспандэнцый.

Але, адзначаючы ўсё станоўчае значэньне генэральнай праверкі, мы паўсюдна, што цэлы рад раённых арганізацый з тым большай рэзкасьцю падкрэсьліць, што ня ўсе яны правілі ў гэтым большай рэзкасьцю падганізацый правяў недапушчальную прыемства, паказаў наўменьне скарыстаць гэтую магутную зброю мабілізацыі мас, прыцягненьня іх да непасрэднай актыўнай барацьбы за высокія тэмпы работы.

Есьць далёка не адзіныя выпадкі, калі ў раёнах **зусім** адсутнічалі нават **праверачныя брыгады**, калі дзяльгі супакойваліся на стварэньні раённых штабаў і лічылі, што гэтым выканалі дырэктыву ЦК КП(б)Б аб правядзеньні месячніка праверкі і самаправеркі ўборкі ўраджаю.

Ня дзіўна, што ў гэтых раёнах маецца глыбокі прарыў у такой важнейшай галіне, як **улік працы** ў калгасах, між тым як праверачныя камісіі ў радзе месц значна **дапамаглі** калгасам наладзіць гэту справу.

Напляваўцельскія адносіны да месячніка з боку некаторых раённых арганізацый з усёй яснасьцю гавораць аб тым, што яны лічэ не навучыліся працаваць па-новаму, апіраючыся на творчы энтузіязм працоўных мас, скарыстоўваючы ўсе вагары ўзьдзейнасьці.

У сувязі з гэтым ня лішне напомніць аб тым, як Лёзьняншчына, якая апынулася ў пачатку праверкі ў тыле ўборачнай кампаніі, своячасова ўлічыла сыгналы друку, здолела хутка перабудавацца, уцягнуць у сапраўдную барацьбу за лён шырокія масы калгасьнікаў і аднаасобнікаў і дабіцца шпаркага **пералому** ў ходзе ўборкі.

З апартуністычнай недаацэнкай арганізацыйна-масавай работы, з бюракратычнай самаўпэўненасьцю і спробамі вырашаць вялікія гаспадарчыя задачы габінэтным шляхам, з нежаданьнем працаваць **разам з масамі**, з няўменьнем **стаць на чале гэтых мас**, трэба рашуча змагацца. З практыкі генэральнай праверкі трэба ўлічыць самыя сур'ёзныя ўрокі на будучы час.

Месячнік генэральнай праверкі і самаправеркі скончыўся. Але **барацьба за асноўныя задачы асеньняй сельска-гаспадарчай кампаніі толькі яшчэ разгортваецца.** Гэта трэба цьвёрда і цьвёрда запомніць. Тэмпы ўборачнай павінны **нарастаць** з дня ў дзень. Увесь вопыт, накоплены ў часе праверкі неабходна шырока скарыстаць у далейшым. Узяць у штыхі ўсякага роду дэмабілізацыйныя настроі, разьлікі на самацёк.

Скончыць уборку збожжавых і тэхкультур, правесьці другі ўкос, засеяць азімы клін, падняць зяб, завяршыць уздым папару, па-баявому арганізаваць сельска-гаспадарчыя загатоўкі—усё гэта патрабуе напружаньня сіл і энэргіі партарганізацый, поўнай мабілізацыі рабочай клясы, усіх яе арганізацый.

Вырашэньне гэтых адказьнейшых задач немысьліма бяз упартай, штодзённай барацьбы за **арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў**, за ўкараненьне зьдзельшчыны, ацэненай ў прададзёх, за падняцьце арганізацыі працы ў калгасах на вышэйшую ступень, без прыцягненьня ўвагі бядняцка-серадняцкіх мас **аднаасобнікаў** да бягучых практычных задач с.-г. кампаніі.

Наносячы скрышальныя ўдары па кулаку і яго агентах-апартуністах, змагаючыся за высокія тэмпы палявых работ, выкарчоўваючы недаацэнку арганізацыйна-масавых мерапрыемстваў, мы даб'ем поўнай перамогі на фронце ўборачнай і асеньняй пасеўнай кампаніі, пасунем пераможна наперад справу сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі.

Месячнік генэральнай праверкі скончыўся, барацьба за баявое нарастаньне тэмпаў уборачнай кампаніі працягваецца!

# Разьбіць ураўнілаўку

**Устанаўленьне правільнай сыстэмы зарплаты зьяўляецца адным з важнейшых момантаў перабудовы работы прамысловасьці ў адпаведнасьці з новымі ўмовамі гаспадарчага будаўніцтва.**

Тав. Сталін у сваёй прамове адзначыў: «ТРЭБА АРГАНІЗАВАЦЬ СЫСТЭМУ ТАРЫФАЎ, ЯКАЯ-Б УЛІЧВАЛА РОЗЬНІЦУ ПАМІЖ ПРАЦАЙ КВАЛІФІКАВАНАЙ І ПРАЦАЙ НЕКВАЛІФІКАВАНАЙ, ПАМІЖ ПРАЦАЙ ЦЯЖКОЙ І ПРАЦАЙ ЛЕГКАЙ».

Сыстэма зарплаты і ў прамысловасьці БССР мае буйнейшыя недахопы і патрабуе неадкладных мер да рашучага паляпшэньня. Ва ўсю шырыню паўстае пытаньне аб ліквідацыі размычкі паміж кваліфікацыяй і аплатай працы. Нельга далей мірыцца з такімі фактамі, калі напрыклад, на заводзе «Пралетары» ў Гомелі рабочы 3-га разраду зарабляе больш брыгадзіра (брыгада па растваральнышах), рабочы 3-га разраду атрымлівае аднолькавую плату з высокакваліфікаваным сьлесарам. На пасазаводзе «Кал. праца» заработак рабочых 5-га і 6-га разрадаў менш заработку рабочых 3-га разраду. На фанэрным заводзе Бобруйскага дрэваапрацоўчага камбінату рабочы 5-га разраду атрымлівае 3 руб. 13 коп. у дзень, а падавальшчык фанэры (3-ці разрад) — 4 руб. 12 коп. Каваль 6-га разраду атрымлівае 7 руб. 99 коп., а 5 разраду — 8 руб. 27 коп. Высокакваліфікаваны цесьляр (Жлубуд у Менску) 5 руб. 84 коп., а чорнарабочы —3 руб. 12 коп.). Такое-ж становішча мецца і на «Сельмашы», «Герой працы» і на іншых прадпрыемствах. На фабрыцы «Дзьвіна» ватарашчыцы—ардынарцы цэх—атрымліваюць меншую заработную плату, чым малакваліфікаваныя работніцы.

Ураўнілаўка ў зарплаце выклікае значную ЦЯКУЧАСЬЦЬ рабочай сілы. Па выбарачным абсьледаваньні 60 прадпрыемстваў за першы квартал гэтага году прыйшла рабочых 16,2 проц., а пакінула прадпрыемства 14,6 проц. да агульнай колькасьці працуючых на гэтых прадпрыемствах. У параўнаньні з мінулым годам, у лепшым выпадку, цякучасьць павялічылася на 17,6 проц. Гэта можна б'е па выкананьні колькасных і якасных паказальнікаў прамфінплану. Адсюль паўстае задача: ЛІКВІДАВАЦЬ УРАЎНІЛАЎКУ І 

# Аб мерах паляпшэньня грамадзкага харчаваньня

## (ПАСТАНОВА ЦК УсеКП(б) АД 19 ЖНІЎНЯ 1931 г.)

**«Рашаючыя посьпехі ў галіне гаспадарчага будаўніцтва СССР, культурны рост мас і ўцягненьне членаў рабочай сям'і ў вытворчасьць у сувязі з поўнай ліквідацыяй беспрацоўя ставяць перад спажыўкаапэрацыяй задачу паступовага пераключэньня харчаваньня забесьпячэньня з форм індывідуальнага спажываньня на грамадзкае харчаваньне, як першую ўмову «пераходу ад дробнай адзінкавай, хатняй гаспадаркі да буйной, абагуленай» (Ленін). (Сьнежанскі пленум ЦК УсеКП(б).**

ЦК канстатуе, што за гады рэалізацыі грамадзкае харчаваньне дасягнула значнага разьвіцьця: ахоплена грамадзкім харчаваньнем 5 мільёнаў рабочых, 500 тысяч іншых працоўных у гарадох; 3 мільёны дзяцей у школах абслугоўваюцца гарачымі сьнеданьнямі, сетка грамадзкага харчаваньня дасягнула 13.400 адзінак; пабудавана значная колькасьць фабрык-кухань і механізаваных сталовых, у капітальнае буйніцтва ўкладзена толькі за апошнія гады больш 200 млн. руб. ЦК лічыць, што ня гледзячы на гэтыя посьпехі, стан грамадзкага харчаваньня не задавальняе ўзросшых патрэбы мас і мае рад вялізарнейшых недахопаў, якія зносяць сур'ёзную шкоду справе паляпшэньня рабочага харчаваньня і забесьпячэньня.

Буйнейшымі недахопамі грамадзкага харчаваньня зьяўляюцца: нездавальняючыя абеды, якія залежаць галоўным чынам ад дрэннай пастаноўкі справы; адсутнасьць грамадзкага харчаваньня; антысанітарны стан сталовых, недапушчальна нізкае абслугоўваньне спажыўцоў; слабая матар'яльна-тэхнічная база; дрэнная не выкарыстоўваньне; перашкода прадпрыемстваў грамадзкага харчаваньня; адсутнасьць гаспадарчага разьліку, безгаспадарчасьць і безадказнасьць адміністрацыйна-тэхнічнага пэрсаналу; ніякая кваліфікацыя кухарскага пэрсаналу; ураўнілаўка ў зарплаце, безгаспадарчасьць у арганізацыі працы і стаўленьне працоўнае дысцыпліны; невыстарчальная ўвага да грамадзкага харчаваньня з боку каапэрацыйных, партыйных, прафэсыянальных і савецкіх арганізацый.

Недаючы выключна важнае значэньне арганізацыі і шырокаму разгортваньню грамадзкага харчаваньня для карэннага паляпшэньня забесьпячэньня рабочых мас, выпітваньня прыкучасьці рабочай сілы і выкананьня прамфінпляну, ЦК зварочвае ўвагу ўсіх каапэрацыйных, партыйных, прафэсыянальных і гаспадарчых арганізацый на тое, што індустрыялізацыя краіны і пераход да буйной арамадзнай гаспадаркі патрабуюць такой пастаноўкі грамадзкага харчаваньня, якое-б забясьпечвала на справе шырокім масам рабочых, служачых і членаў іх сем'яў магчымасьць у поўнай меры карыстацца паслугамі грамадзкага харчаваньня.

У мэтах каранных паляпшэньня грамадзкага харчаваньня ЦК УсеКП(б) пастанаўляе:

а) Вылучыць грамадзкае харчаваньне ў Маскве, Ленінградзе і прамысловых пунктах Данбасу і Уралу з сыстэмы спажыўкаапэрацыі і арганізаваць у гэтых раёнах дзяржаўныя трэсты і аб'яднаньні народнага харчаваньня ў сыстэме Наркамснабу, якія працуюць на гаспадарчым разрахунку, стварэньні для кіраўніцтва іх дзейнасьцю ў сыстэме Наркамснабу СССР. Галоўнае кіраўніцтва па народным харчаваньні («Саюзнархарч»).

б) У астатніх вобласьцях, раёнах і гарадох арганізацыю грамадзкага харчаваньня ажыцьцяўляць праз Усекаапхарч, як аўтаномную сэкцыю спажывецкай каапэрацыі з тым, каб работа Усекаапхарча была канкрэтным чынам рэарганізавана і палепшана.

в) Прадаставіць аб'яднаньням і сталовым Усекаапхарча таксама, як і аб'яднаньням і прадпрыемствам народнага харчаваньня Наркамснабу, права самастойных заатовак.

## I. МЕРАПРЫЕМСТВЫ ПА ПАЛЯПШЭНЬНІ РАБОТЫ ІСНУЮЧЫХ СТАЛОВЫХ

### 1.

ЦК адзначае вусім нецярпімым становішча з санітарным станам у радзе прадпрыемстваў грамадзкага харчаваньня: пануючасьць фактаў антысанітарнай апрацоўкі прадуктаў, неахайнай мойкі і адносін да начыньня, дрэннага хаваньня прадуктаў, якое вядзе да псаваньня, адсутнасьці санітарнага нагляду.

ЦК лічыць, необходным, каб пэрсанальная адказнасьць за санітарны стан прадпрыемстваў народнага харчаваньня была ўскладзена на загадчыкаў сталовых і дырэктароў фабрык-кухань.

НКАЗ і органам аховы здароўя ўстанавіць спэцыяльны нагляд за санітарным станам усіх прадпрыемстваў грамадзкага харчаваньня, з прыцягненьнем вінаватых да адказнасьці, а судовым органам сурова караць вінаватых у далучэньні антысанітарнага стану сталовых.

Для ўзмацненьня кантролю над грамадзкім харчаваньнем арганізаваць пры РСІ спэцыяльную інспэкцыю з прыцягненьнем работнікаў ГПУ і пралетарскай грамадзкасьці, усклаўшы на яе нагляд за якасьцю харчаваньня, правільным абслугоўваньнем спажыўца і санітарным станам сталовых.

### 2.

Увесьці ва ўсіх прадпрыемствах грамадзкага харчаваньня бракоўку прадуктаў і абедаў. Усекаапхарчу і трэстам нархарчаваньня Наркамснабу прыцягнуць да ўдзелу ў бракоўцы разам з інспэктурай саміх спажыўцоў і заводскую грамадзкасьць.

### 3.

Усклясьці на праўленьне каапэрацыі ных арганізацый, Усекаапхарч і трэсты народнага харчаваньня Наркамснабу адказнасьць за дастаўку прадпрыемствам грамдзкага харчаваньня добраякасных прадуктаў, абазнаёўшы загадчыкаў сталовак і дырэктароў фабрык-кухань адмаўляцца ад прыёму недобраякасных прадуктаў.

### 4.

Увесьці большую рознастайнасьць у меню фабрык-кухань і сталовых, яго зьвязваючы спажыўца стандартнымі абедамі, і шырока разгарнуць на прадпрыемствах работу буфетаў, у прыватнасьці ўвесьці абеды па розных цэнах.

### 5.

Абавязаць Усекаапхарч і трэсты народнага харчаваньня Наркамснабу ў першую чаргу паляпшыць пастаноўку грамадзкага харчаваньня ў вядучых галінах прамысловасьці, гарачых і шкодных цэхах прадпрыемстваў і ўстанавіць кругласутачнае абслугоўваньне гарачай ежай, і ў першую чаргу рабочых гэтых цэхаў.

### 6.

Устанавіць з 1 верасьня заахвочвальную сыстэму аплаты працы на прадпрыемствах грамадзкага харчаваньня (сталовых, фабрык-кухні), на аснове прагрэсыўнай зьдзельшчыны. Правядзеньне зьдзельшчыны ў прадпрыемствах грамадзкага харчаваньня абавязкова ўвязаць з якасьцю ежы, дзеля чаго ўстанавіць кантроль за прыёмам прадукцыі, матар'яльную адказнасьць за далучэньне браку і прэмію за паляпшэньне якасьці апрацоўкі.

Паставіць рабочых фабрык-кухань і буйных мэханізаваных сталовых у адноўкавыя ўмовы з рабочымі прамысловых прадпрыемстваў як у адносінах зарплаты, так і ў адносінах забесьпячэньня прамтаварамі. Павысіць зарплату кухароў да ўзроўню кваліфікаваных рабочых прамысловасьці.

### 7.

Прапанаваць Наркамснабу і Цэнтрасаюзу шырока разгарнуць работу па рамонце існуючай сеткі сталовых і абсталяваньні іх, абавязаўшы ВСНГ і Наркампрацы аказаць практычную дапамогу як у адносінах рабочай сілы, так і ў забесьпячэньні неабходнымі матар'ялам.

Усклясьці на заводакіраўніцтвы адказнасьць за прадаставленьне ў сваіх прадпрыемствах зусім годных і добрапрыстасаваных памяшканьняў пад сталовыя і буфэты для рабочых і аказаньне рэальнай дапамогі ў справе бягучага рамонту інвэнтару і абсталяваньня і ў асаблівасьці ў адносінах пелуды кухоннага і сталовага інвэнтару.

Абавязаць заводакіраўніцтвы буйных прадпрыемстваў пры тэрміновай сыстэме забесьпячэньня рабочых абедамі, забясьпечыць неабходнае абсталяваньне і памяшканьне для награваньня ежы.

### 8.

Абавязаць Наркамснаб і Цэнтрасаюз не ганяцца за павялічэньнем колькасьці абедаючых, за кошт пагаршэньня якасьці абедаў і ўстаноўленых норм па грамадзкім харчаваньні. Устанавіць, што ўсякае павялічэньне колькасьці абедаючых, што выходзіць за межы цэнтралізаваных харчфондаў павінна ісьці, як правіла, за лік мабілізацыі дадатковых мясцовых харчовых рэсурсаў. У мэтах павялічэньня харчовых рэсурсаў для грамадзкага харчаваньня, разгарнуць шырока сетку дапаможных прадпрыемстваў пры сталовых па сьвінаадкорме, птушнікце, трусагадоўлі і інш., прычым прадукцыю іх поўнасьцю замацаваць за сталовымі.

### 9.

Абавязаць Наркамснаб і яго галінныя аб'яднаньні, таксама як і органы спажыўкаапэрацыі, пры забесьпячэньні прадпрыемстваў грамадзкага харчаваньня прадуктамі цэнтралізаваных фондаў забясьпечыць сваячасовы завоз прадуктаў па адпаведным асартымэнце, згодна заключаных дагавароў.

## II. ЗАБЕСЬПЯЧЭНЬНЕ ІНВЭНТАРОМ ФАБРЫК-КУХАНЬ І СТАЛОВЫХ

### 10

Для забесьпячэньня прадпрыемстваў грамадзкага харчаваньня інвэнтаром і абсталяваньнем у 1931 г. абавязаць ВСНГ СССР поўнасьцю выканаць дагавары, заключаныя Усекаапхарчам з прамысловасьцю на 1931 год на абсталяваньне і інвэнтар (29,5 млн. руб.), пераглядзець вытворчы асартымэнт фарфару і фаянсу ў бок павялічэньня ў 2-м паўгодзьдзі 1931 г. выраб талерак за лік іншых сыграбаў, забясьпечыць поўнасьцю патрэбы грамадзкага харчаваньня ў шклянках, выканаць вытворчую праграму па алюмінэвых лыжках, на жох і відзельцах, выканаць пададковую праграму абсталяваньня для грамадзкага харчаваньня звыш заключаных дагавароў паводле сыпісу, зацьверджанага СПА.

### 11.

Абавязаць Усекаапрамсаюз арганізаваць у другім паўгодзьдзі 1931 г. выраб дрэўляных лыжак, нажэй, відэльцаў і кухоннага інвэнтару, паводле сыпісу, зацьверджанага СПА. Камітэту па саматужнай прамысловасьці пры СПА ўстанавіць нагляд за правядзеньнем гэтых дырэктыў і аказаць дапамогу для рэалізацыі гэтай праграмы саматужнапрамысловай каапэрацыі, выдзяленьнем неабходных дадатковых фондаў сырцу.

### 12.

Наркому замежнага гандлю неадкладна вылучыць арганізацыям грамадзкага харчаваньня ня менш 125 тон волава для лужэньня кухоннага інвэнтару.

### 13.

Савету Працы і Абароны вылучыць для патрэб грамадзкага харчаваньня ў 1931 г. 300 штук грузамашын.

### 14.

У мэтах забесьпячэньня абсталяваньнем і інвэнтаром як існуючых сталовых і фабрык-кухань, так і тых, што пачнуць будуюцца і ў мэтах далейшага разгортваньня мэханізацыі грамадзкага харчаваньня ў адпаведнасьці з плянам:

а) Прапанаваць ВСНГ СССР арганізаваць трэст саюзнага значэньня па выробе абсталяваньня, для грамадзкага харчаваньня, вылучыўшы ў склад гэтага трэсту ў першую чаргу заводы «Вулкан» — Ленінград, «Механолит»—Харкаў, заводы Мосмета №№ 18 і 21 — Масква, з тым, каб да 1 верасьня прадставіць поўны сыпіс заводаў гэтага трэсту;

б) абавязаць Усекаапрамсаюз шырока разгарнуць вытворства кухоннага, сталовага і гаспадарчага інвэнтару для прадпрыемстваў грамадзкага харчаваньня, а ВСНГ СССР — забясьпечыць прамысловую каапэрацыю адпаведнымі фондамі матэрыялу.

### 15.

Забясьпечыць скарачэньне ў 1931 г. пачатага будаўніцтва фабрык-кухань і сталовых пры прадпрыемствах, пераўкладуючы гэта будаўніцтва да ўдарных будоўляў прамысловасьці. Абавязаць ВСНГ СССР забясьпечыць гэтыя будоўлі будматар'ялам і абсталяваньнем.

### 16.

Прапанаваць СПА ў дэкадны тэрмін устанавіць на прадстаўленьні Усекаапхарча, Наркамснабу, ВСНГ СССР і УсеЦСПС сыпіс прадпрыемстваў грамадзкага харчаваньня, якія падлягаюць пуску ў 1931 г. і неабходныя для гэтай мэты мерапрыемствы.

## III. АБ ПЛЯНЕ РАЗВІЦЬЦЯ ГРАМАДЗКАГА ХАРЧАВАНЬНЯ

### 17.

ЦК лічыць неабходным разгарнуць грамадзкае харчаваньне з такім разьлікам, каб у бліжэйшыя 2-3 гады падвоікам, каб у бліжэйшыя 2-3 гады падвоіць лік рабочых, служачых і членаў іх сем'яў, што абслугоўваюцца грамадзкім харчаваньнем, з дасягненьнем ліку абслугоўваючых да 25 млн. чалавек і дабіцца поўнага ахопу гарачымі сьнеданьнямі школьнікаў і дзяцей якія абслугоўваюцца дашкольнымі ўстановамі.

### 18.

У адпаведнасьці з гэтым даручыць Дзяржпляну СССР да 1 студзеня 1932 году з удзелам Усекаапхарчу і Наркамснабу, распрацаваць плян разьвіцьця грамадзкага харчаваньня на 1932-33 г., паклаўшы ў аснову наступнае:

а) пераход ад фабрык-кухань з тэрміновай сыстэмай да фабрык загатоўчых з сеткай сталовых пры фабрыках і заводах, якія забясьпечваюць абслугоўваньне рабочых гарачай ежай;

б) будаўніцтва ня менш 250-300 фабрык загатоўчых з сеткай да 3-4 тыс. сталовых пры фабрыках і заводах.

## IV. КАДРЫ

### 19.

Абавязаць Цэнтрасаюз, Усекаапхарч і Наркамснаб забясьпечыць падрыхтоўку кадраў для гарадзкога сэктару на 1931-32 г. па грамадзкім харчаваньні кухароў, дырэктароў фабрык-кухань і загадчыкаў сталовымі, рахункавых работнікаў, пармоўшчыкаў і інш. Разгарнуць сетку ФЗВ грамадзкага харчаваньня, тэхнікумаў і правесьці арганізацыю спэцыяльнага ВНУ.

### 20.

Захаваць адпрацентны адлік па звароту грамадзкага харчаваньня на падрыхтоўку кадраў і навукова-дасьледчую работу па грамадзкім харчаваньні абавязаўшы Цэнтрасаюз і Наркамснаб поўнасьцю забясьпечыць выкарыстаньне гэтых сродкаў выключна на пакаданым прызначэньні.

### 21.

Абавязаць мясцовыя, партыйныя, саветскія і прафэсыянальныя арганізацыі прыняць усе неабходныя меры да ўмацаваньня апарату грамадзкага харчаваньня кваліфікаванымі работнікамі і правесьці ў гэтых мэтах у месячны тэрмін мабілізацыю 500 членаў партыі ў буйнейшых прамысловых цэнтрах.

### 22.

Разарганізаваць часопісі «Рабочай общественного питания» і «Общественное питание» у газэту ЦК саюзу, Усекаапхарча і Галоўнага кіраўніцтва Наркамснабу па народным харчаваньні з выхадам яе адзін раз у пяцідзеньку.

ЦК абавязвае ўсе партыйныя, камсамольскія, прафсаюзныя, каапэрацыйныя і гаспадарчыя арганізацыі ў найкарацейшы тэрмін забясьпечыць сапраўдны пералом у справе грамадзкага харчаваньня, разгарнуўшы масавую работу па палітычным выхаваньні рабочых грамадзкага харчаваньня, укараненьні ў іх асяродак культурных навычак, мэтадаў спаборніцтва і ўдарніцтва і прыцягваючы ў справу будаўніцтва і кантролю над прадпрыемствамі грамадзкага харчаваньня шырокія рабочыя масы.

ЦК лічыць, што кожны рабочы, кожны член партыі і камсамолец і ў першую чаргу ўсе, хто працуе ў прадпрыемствах грамадзкага харчаваньня, абавязаны забясьпечыць на справе пасьпяховую барацьбу з усякімі недахопамі грамадзкага харчаваньня і пераадольваць яго ў важнейшае зьвяно ў рабоце па паляпшэньні быту рабочай кляасы.

ЦК УсеКП(б).

НАСУСТРАЧ НАВУЧАЛЬНАМУ ГОДУ

# ЗАСТАЛАСЯ АДНА ДЭКАДА

## СТАРОБІН, ВІЦЕБСК, АСЬВЕЯ У ГЛЫБОКІМ ТЫЛЕ ПАДРЫХТОЎКІ

### ДНІ АПОШНЯЙ ДЭКАДЫ ЗАПОЎНІЦЬ САПРАЎДЫ ШТУРМАВОЙ, УДАРНАЙ РАБОТАЙ

### Да эдказнасьці за зрыў падрыхтоўчай работы

ВІЦЕБСК, 19. (БЕЛТА). ГарКК-РСІ вынесла пастанову аб становішчы падрыхтоўкі да новага навучальнага году ў школах Віцебску. ГарКК канстатавала, што падрыхтоўка да новага навучальнага году ў Віцебску праходзіць вельмі слаба. Тэмпы падрыхтоўкі не забясьпечваюць сваячасовага пармальнага пачатку заняткаў.

Статбюро за паўтара месяца нават ня вылічыла ўсіх дзяцей і дарослых, якія падлягаюць усеагульнаму навучаньню. Ня выкананa пастанова гарсавету аб увядзеньні ўсеагульнага навучаньня на базе сямігодкі ў нёсцы.

На «Дзьвіне», «Сьцягу індустрыялізацыі» і «Прафінтэрне» ёсьць значныя прарывы па ліквідацыі нпісьменнасьці. Адсутнічае дакладны ўлік няпісьменных. Культсэктары фабкому паклалі ў архіў свае абяцаньні і пастановы аблікідаваць няпісьменнасьці сярод рабочых і работніц.

Ня гледзячы на пастанову гарКК ад 18 мая г.г., будаўніцтва і рамонт індустрыяльнага пэдінстытуту, маркаўшчынскай сямігодкі і вясковых школ ідзе марудным тэмпам. Будаўніцтва 17 сямігодак адкладаецца ўжо другі год і яшчэ не распачата. Сельсаветы стаяць у баку ад падрыхтоўкі да новага навучальнага год

ГарКК у сваёй пастанове канстатавала рыў работы курсаў па падрыхтоўцы ў ФЗВ: металістаў, абутнікаў, тэкстыльшчыкаў, канторучу і ў тэхнікумы—пэдагагічны, яўрэйскі і садова-гародны. За зрыў работы па курсах гар. інспэктар прафсаюзы Кантаровіч і загадчыкі вышэйнамянёных ФЗВ прыцягнуты да адказнасьці. Ім прапанавана на працягу дэкады нападзіць работу курсаў. ГарКК вынесла ад канкрэтных мерапрыемстваў, якія накіраваны на падрыхтоўку да новага навучальнага году. Раду арганізацый і навучальных устаноў прапанавана разгарнуць ударную работу на ліквідацыі прарыву, які стварыўся ў справе падрыхтоўкі да новага навучальнага году ў Віцебску.

### Старобінскі рэён не падрыхтаваны

РВК ня прымае ніякіх мер, каб забясьпечыць 13 школ, што будуюцца, необходным матар'ялам. Пераважная большасьць школ не забясьпечана мабліяй. У калінінскіх хутарох два гады гніе будаўнічы матар'ял. Доўгаўская сямігодка да пачатку заняткаў ня будзе скончана.

Уніх дзяцей школьнага ўзросту, няпісьменных і малапісьменных па некаторых сельсаветах не праведзен. (Чыдзвіцкі сельсавет і інш.).

Пры сельсаветах няма складзеных жнаў адкрыцьця новых ліквпунктаў і школ малапісьменных. Зусім дрэнна ідзе справа з бібліятэкамі і дамамі сацыялістычнай культуры. Усе яны маль не працуюць. Бібліятэкі засьмечаны шкодная літаратурай. Вельмі марудна ідзе будаўніцтва мясцовага дому сацкультуры. Загадчык замест таго, каб праводзіць культурную работу з насельніцтвам, праводзіць увесь час на калгасным. Закінута зусім работа грамадзкіх арганізацый.

Загадчык дамнаванідкага дому сацкультуры Мошна работы ніякай не вядзе.

Старобінскі РК КП(б)Б павінен арганізаваць сур'ёзнасьць становішча і зрабіць усе вынікаючыя адсюль выводы.

Брыгада «Зьвязды»: ПАРАШЧАНКА І ЛОСЕЎ.

### Стаўкана „здаровы" самацёк

ВІЦЕБСК, 19. (БЕЛТА). 13 жніўня з удзелам рабкораў-ударнікаў газэт «Праўда», «Віцебскі пралетары» і часопісі «Красное студенчество» ў Віцебску быў праведзен рэйд праверкі падрыхтаванасьці арганізацый гораду і навучальных устаноў да 1931-32 навучальнага году.

Матар'ялы рэйду сьведчаць аб тым, што большасьць навучальных устаноў да новага навучальнага году ня рыхтуюцца, спадзяючыся на апартуністычны самацёк. Дырэктар палітэхнікуму на запытаньне брыгады, ці гатоў палітэхнікум да 1931-32 ударнага навучальнага году, адказаў: «Справа стаіць вельмі добра, непатрэбна папулярызацыі тэхнікуму сярод шырокіх мас рабочых, ніякіх брыгад на вытворчасьць тэхнікум не пасылаў і пасылаць ня лічыць патрэбным. Камплектаваньне ідзе бліскуча. Самацёк здаровы. Ужо ёсьць больш 800 заяў, апрача нераглядженых. Па сацыяльным складзе і партыйнасьці падбор добры».

Як-жа ў сапраўднасьці? Інтэрнат палітэхнікуму разьлічан на ⅔ усіх студэнтаў, а іх будзе прынята 620 чал. Бытавое становішча студэнтаў дрэннае. У інтэрнаце ўжо цяпер вялікая цесната. Харчаваньне студэнтаў наладжана дрэнна.

З 476 студэнтаў толькі 176 рабочых—37 проц. Гэта ярка сьведчыць аб шкодлівасьці «здаровага» самацёку. Умовы прыёму не даведзены да шырокіх рабочых мас. У выкладальні палітэхнікуму яшчэ існуе абязьлічка. Вучэбныя пляны і праграмы не падрыхтаваны.

Віцебскі рабфак. Тут 150 студэнтаў з новага набору ня будуць забясьпечаны інтэрнатам. Медычны тэхнікум да новага навучальнага году таксама не падрыхтаваўся.

У наяўнасьці ёсьць прарывы ў камплектаваньні вэтінстытуту, агрападтэхнікуму, мэдтэхнікуму і раду іншых навучальных устаноў. Вэтінстытут павінен прыняць больш 500 чалавек, паступіла-ж заяў на сёньняшні дзень 58. На вячэрнае аддзяленьне паступілі толькі 3 заявы. У ветэрынарны тэхнікум прынятыя ўсяго 3 чал., з іх адзін толькі партыец. Дырэктыва ЦК ЛКСМБ усім рабфакам арганізацыям аб камандыраваньні ў вэтінстытут на адным чалавеку з кожнага раёну выкананa. Арганізацыі, зацікаўленыя ў падрыхтоўцы кадраў сацыялістычнай жывёлагадоўлі, нічога ня робяць, каб укамплектаваць вэтінстытут.

Будаўніцтва і рамонт інтэрнату віцебскае аддзяленьне Белбудканторы праводзіць чарапашымі тэмпамі. У інтэрнатах няма вады, бо ня зроблены вадапрагоны.

Гапебныя адносіны да падрыхтоўкі навучальнага году існуюць у сельсаветаў.

### За месяц—ніякіх зьмен

АСЬВЕЯ. 20. (БЕЛТА). З прычыны апартуністычнай недаацэнкі справы навучаньня з боку райвыканкому і раду партыйных ячэек раёну (Сенькаўская, Красоўская і інш.), дырэктыва РКК КП(б)Б па школьным будаўніцтве ня выкананa.

Паўтаральна з тым, што было ў падрыхтоўцы да навучальнага году месяц таму назад, ніякіх зьмен не адбылося.

Падручнікамі школы забясьпечаны толькі напалову. Ні адна школа раёну ніяко не адрамонтавана. Толькі 2 школы з 48 пачалоў забясьпечаны апаламі. Ад пераходзе на тарфіны апал райінспэктарыят нічога ня робіць. Культурныя сазны як ары РВК, так і сельсаветах не арганізаваны. З усіх школ, якія будуюцца ўжо 2-3 гады, ні адна яшчэ ня скончана. Дырэктыва партыі аб матар'яльным забясьпечаньні пастаўніцтва выконваецца ня поўнасьцю. Ёсьць выпадкі, калі на некалькі месяцаў пастаўнікам ня выплачваецца зарплата.

# Сваячасова лён убраць, апрацаваць і здаць дзяржаве такава задача!

Ільнаводчыя калгасы, саўгасы і ільнаапрацоўчыя заводы

Сьледуйце прыкладу „Дзьвіны" і калгасьнікаў Лёзьняншчыны! Арганізуйце вытворчую ўзаемадапамогу!

### ДА ЎСІХ КАЛГАСАЎ І КАЛГАСЬНІКАЎ БЕЛАРУСІ

Пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі рабочая кляса і бяднацка-сераднацкія масы вёскі, аб'яднаўшыся ў калгасы, дабіліся рашучых посьпехаў у справе індустрыялізацыі і сацыялістычнай перабудовы сельскай гаспадаркі нашай краіны.

У выніку пасьлядоўнага правядзеньня генэральнай лініі партыі і бязьлітаснай барацьбы з кулацтвам і яго агентурай, правымі апартуністамі і «левымі» загібшчыкамі, на аснове разгортваньня сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва калгасы БССР увесну гэтага году дасягнулі вялізарнейшых посьпехаў у справе выраўнаньня праблемы тэхкультур. Вызначаны плян засеву ільну ў 86 тыс. гэкт. ня толькі выкананa, але і перавыкананa, у выніку чаго фактычная плошча засеву дасягнула 107,5 тыс. гэкт.

Аднак, гэтыя посьпехі ў пашырэньні плошчы засеваў ільну будуць замацаваны толькі тады, калі на фронце ўборкі і пераапрацоўкі калгасы выйдуць пераможцамі і сваячасова здадуць нашай сацыялістычнай прамысловасьці неабходны сырэц.

Між іншым, ужо ў пачатку ўборкі ільну відаць, што рад калгасаў не забясьпечваюць патрэбных тэмпаў, каб у вызначаны тэрмін скончыць уборку і пераапрацоўку ільну. Галоўнай прычынай такога становішча зьяўляецца няправільная арганізацыя працы і адсутнасьць зьвязьлічыны ў гэтых калгасах. Трэба з усёй рашучасьцю падкрэсьліць, што тыя калгасы, якія разгарнулі ўборку бальшавіцкімі тэмпамі на аснове правільнай арганізацыі працы і ўкараненьня зьдзельчыны ўборку ільну скончылі раней тэрміну. Так калгасы **Сураскага раёну** на працягу 5-ці дзён убралі 50 проц. усёй плошчы ільну. Калгасы **«Інтэрнацыянал»** і **«Перадзвін»**, Лёзьнянскага раёну ўборку скончылі раней на 18 дзён устаноўленага тэрміну.

Таварышы калгасьнікі і калгасьніцы! Сацыялістычная прамысловасьць чакае ад вас сырцу. **Вашай галоўнейшай задачай зьяўляецца сваячасова ўбраць, пераапрацаваць і здаць дзяржаўнай прамысловасьці лён.**

Калгаспэнтр заклікае вас стаць на шлях калгасаў і калгасьнікаў Лёзьнянскага раёну, якія на адозву рабочых фабрыкі «Дзьвіна» абавязаліся, на аснове ўзаемнай вытворчай дапамогі ліквідаваць прарывы па ўборцы ільну, датэрмінова скончыць пераапрацоўку і поўнасьцю здаць лён.

Калгаспэнтр зварачаецца да ўсіх праўленьняў калгасаў і калгасьнікаў у адказ на заклік рабочых фабрыкі «Дзьвіна» (газэта «Зьвязда» ад 14 жніўня г. г.) і калгасьнікаў Лёзьнянскага раёну (газэта «Зьвязда» ад 18 жніўня г. г.), разгарнуць бальшавіцкімі тэмпамі ўборку ільну і на аснове вытворчай ўзаемадапамогі, ударніцтва і сацыяспаборніцтва датэрмінова скончыць уборку і пераапрацоўку ільну і сваячасова забясьпечыць сацыялістычную прамысловасьць сырцом.

КАЛГАСЦЭНТР БССР.

Ільнаўборка

КАДРЫ—ДРУКУ

# РЫХТАВАЦЬ КАДРЫ ДЛЯ ПАРТЫЙНА-САВЕЦКАГА ДРУКУ

## Надыходзіць навучальны год, а газэтныя аддзяленьні навучальных устаноў не ўкамплектаваны

### Безагаворачна выканаць партыйную дырэктыву

Наш бальшавіцкі друк расьце, як кольвасна, так і якасна. Яго роля ў разгорнутым сацыялістычным наступленьні з кожным днём павышаецца. Бурна расьце сетка раённых газэт, фабрычна-заводзкіх, калгасных і саўгасных шматтыражак. Шпаркі рост нашага партыйна-савецкага друку настойліва дыктуе необходнасьць масавай падрыхтоўкі бальшавіцка-вытрыманых, тэарытычна моцных кадраў.

Партыя ў сваіх пастановах аб друку дала выразныя ўказаньні ўсім партыйным арганізацыям аб больш сьмелым выпучэньні на газэтную работу рабсялькораў-ударнікаў, якія праўраны ў змаганьні за генэральную лінію партыі. ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б паставілі канкрэтную задачу: пашырыць сетку навучальных устаноў па падрыхтоўцы газэтных кадраў. ЦК КП(б)Б даў указаньне, што Камвуз імя Леніна, усебеларуская сэльпартшкола, пэдтэхнікум, пэдагагічны інстытут, Віцебскі мастацкі тэхнікум, беларускі, яўрэйскі і польскі тэхнікумы БССР, інстытут масавага завочнага навучаньня і іншыя навучальныя ўстановы павінны арганізаваць сталыя газэтныя аддзяленьні і групы па падрыхтоўцы газэтна-выдавецкіх кадраў.

Як-жа гэта дырэктыва ЦК КП(б)Б праводзіцца ў жыцьцё?

Рад раённых партарганізацый праяўляюць безадказныя адносіны да камплектаваньня газэтных аддзяленьняў навучальных устаноў. ВУЗЬДЗЕНСКІ, БЫХАЎСКІ, АСІПОВІЦКІ, КАМАРЫНСКІ, ЛЕПЕЛЬСКІ І ЎДАРАВІЦКІ райкомы яшчэ ня выканалі даніай разьвёрткі.

Віцебскі мастацкі тэхнікум, пэдтэхнікумы БССР змаль зусім нічога не зрабілі па арганізацыі газэтных аддзяленьняў і груп у бягучым годзе. У пэдагагічны інстытут (газэтнае аддзяленьне) паступілі заявы толькі ў колькасьці 30 і то сярод іх вельмі мала рабочых. Дзяцей рабочых толькі 20-25 проц., а астатнія ў большасьці служачыя. Інстытут масавага завочнага навучаньня, які знаходзіцца пры ЦК КП(б)Б нават ня чытаў пастанову ЦК аб падрыхтоўцы газэтных кадраў. На газэтнае аддзяленьне Камвузу, на лік павінна навучацца 160 асоб, паступіла толькі 8 заяў. Наздавальняюча ідзе камплектаваньне і газэтных аддзяленьняў іншых устаноў.

Цэнтральны Камітэт КП(б)Б абавязаў тэматычна асьвятляць пытаньні падрыхтоўкі кадраў друку. Між тым, рад газэт да гэтага часу не прыступілі да мабілізацыі партыйных арганізацый на выкананьне важнейшай дырэктывы.

Некалькі дзён таму назад ЦК КП(б)Б у сваім пісьце ўсім гаркомам і райкомам катэгарычна абавязаў іх у дэкадны тэрмін поўнасьцю выканаць даную разьвёрстку пасылкі таварышоў на газэтнае аддзяленьне навучальных устаноў. Дэкадны тэрмін ужо даўно прайшоў, а справа з укамплектаваньнем не пасунулася наперад. ЦК КП(б)Б вымушан быў у другі раз абавязаць райкомы і гаркомы выканаць ранейшыя дырэктывы.

Раённыя партарганізацыі, органы друку і ўся пралетарская грамадзкасьць павінны прыняць усе меры для таго, каб справу ўкамплектаваньня газэтных аддзяленьняў навучальных устаноў, паставіць па-баявому. Справа падрыхтоўкі газэтных кадраў — задача кожнага гаркому, райкому і ячэйкі КП(б)Б, кожнай цэнтральнай і раённай газэты. З бальшавіцкай настойлівасьцю трэба дабівацца не поўнага практычнага ажыцьцяўленьня

Б. Зэльцэр.

### Камплектаваньне пад пагрозай

Паступленьне заяў на рэдактарска-выдавецкае аддзяленьне літфака падінстытуту прахоліць пасдавальняюча. На 19 жніўня паступіла ўсяго 33 заявы. Яшчэ менш нас можа задаволіць сацыяльны склад тых, што падалі заявы. Ад рабочых і дзяцей рабочых паступіла ўсяго 10 заяў, ад калгасьнікаў—2 і пераважная колькасьць заяў — 21 — ад служачых.

Дырэктыва ЦК КП(б)Б аб укамплектаваньні рэдактарска-выдавецкага аддзяленьня павінна быць выканана ва што-б там ні стала і з колькасьнага і з якаснага баку. Да пачатку заняткаў засталіся лічаныя дні. Каб уніхнуць прарыву, вылучаныя на вярбоўцы ў падвузы студэнцкія брыгады павінны максымальна ўзмацніць сваю работу на гэтым вучастку. Кожны студэнт павінен адчуваць на сабе адказнасьць за вярбоўку кадраў на газэтнае аддзяленьне. Нікольні ня мешчай адказнасьць за гэту справу прыпадае на партыйна-камсамольскія арганізацыі, прафсаюзныя, рабочую і калгасную грамадзкасьць. Яны павінны рашуча мабілізаваць на ўкамплектаваньне газэтна-выдавецкага аддзяленьня за лік партыйна-камсамольскага актыву, які мае адпаведную падрыхтоўку, лепшых рабочых і калгасьнікаў-ударнікаў і іх дзяцей. Наш пралетарскі друк павінен быць забясьпечан кадрамі.

Дэкан літфаку—БАРЫСЕНКА.

### Сакратаром гарадзкіх і раённых камітэтаў КП(б)Б

Цэнтральны Камітэт КП(б)Б, улічваючы вялізарнае палітычнае значэньне падрыхтоўкі кадраў для раёнцага і цэнтральнага бальшавіцкага друку, даў зусім выразныя дырэктывы гарадзкім і раённым камітэтам КП(б)Б аб поўным выкананьні раскладкі камплектаваньня газэтных аддзяленьняў Камвузу Вел. імя Леніна, усебеларускай сэльпартшколы, усебеларускага палітасьветтэхнікуму і пэдінстытуту.

Між тым, як гледзячы на тое, што з дня дачы дырэктывы прайшло шмат часу, значная частка раёнаў БССР і нават сёньняшні дзень упарта ня выконвае гэтай дырэктывы ЦК КП(б)Б.

Пад асабістую адказнасьць сакратароў ГК і РК катэгарычна прапануем неадкладна поўнасьцю выканаць пасланую Цэнтральным Камітэтам раскладку.

За сакратара ЦК КП(б)Б ГАНТМАН.
Заг. Культпропам ЦК КП(б)Б ЧАРНУШЭВІЧ.

### Шклоўшчына ідзе да перамогі

#### 72 проц. ПАСЕВАЎ ЛЬНУ ВЫЦЕРАБЛЕНА

ШКЛОЎ. (ПА ТЭЛЕГРАФУ). На 20 жніўня па раёне выцераблена 5.865 гэкт. ільну, што складае 72 проц. пляну. З іх калгасамі ўбрана 2.890 гэкт., або 67 проц. Дрэннае кадвор'е затрымала абмалот ільну. Большасьць калгасаў скончылі пераробленьне ільну, і вольную рабочую сілу перакідваюць на дапамогу буйным ільнаводчым калгасам з тым, каб да 25 жніўня поўнасьцю скончыць ільнаўборку.

### 125 калгасьнікаў

#### Рагачоў пасылае на дапамогу Лёзьняншыне

РАГАЧОЎ. (ПА ТЭЛЕГРАФУ). Райкалгассаюзам накіравана ў Лёзьненск

# Калгасьнікі Случчыны арганізавалі збожжавы канвэер

## ЯНЫ Ў ТРЫ РАЗЫ ПЕРАВЫКАНАЛІ ЖНІВЕНЬСКІ ПЛЯН ЗБОЖЖАЗАГАТОВАК

ЗДАНА ЗБОЖЖА на 15 ЖНІЎНЯ (У ТОНАХ)

| Саўгасы і калгасы | Індывідуальны сэктар |
|---|---|
| 862 | 836 |

### Не забываць аб аднаасобным сэктары

Загатоўкі збожжа разгарнуліся па ўсёй БССР. На 15 жніўня Беларусь выканала 24 проц. месячнага пляну збожжазагатовак.

**Найбольшую колькасьць збожжа здаў сацыялістычны сэктар — 862 тоны, аднаасобнікі — 836 тон, па цьвёрдых заданьнях зданы толькі 64 тоны.**

Гэтыя даныя зьяўляюцца лепшым доказам правільнасьці асноўнай установачкі партыі на сацыялістычную рэканструкцыю сельскай гаспадаркі.

Яны гавораць аб тым, што **«рашаючыя перамогі калектывізацыі. рост саўгасаў і МТС, высокі процант таварнай прадукцыі сацыялістычнага сэктару сельскай гаспадаркі стварылі ўсе магчымасьці для хуткага выкананьня пляну збожжазагатовак».** (З настановы ЦК УсеКП(б).

Гэта паказаньне ЦК выразна пацьвярджаецца тым фактам, што ўжо зараз налічваюцца дзесяткі калгасаў, якія выканалі больш паловы гадавога пляну пад лёзунгам — «ніводнага цэнтнэра збожжа прыватніку» (калгасы Шклоўшчыны, Капыльшчыны, Клімаўшчыны і г. д.).

Вышэйпрыведзеныя даныя гавораць аб **адставаньні аднаасобнага сэктару,** удзельная вага якога досыць вялікая (60 проц. гаспадарак). Гэта зьяўленьне вынікам яўнай недаацэнкі аднаасобнага сэктару, парушэньня дырэктыў ЦК УсеКП(б) аб правядзеньні загатовак сярод сялян-аднаасобнікаў.

Невыкананьне пляну здачы збожжа па аднаасобным сэктары павінна быць рашуча зжыта ў бліжэйшыя пяцідзёўкі. Неабходна неадкладна разгарнуць шырокую масавую работу на вёсцы, актывізаваць работу кажнай садзейнасьці загатоўкам, тэрмінова вынішчыць усе кулацка-заможныя гаспадаркі, устанавіць для іх цьвёрдыя заданьні і жорсткімі мерамі прымусіць выканаць іх.

Трэба давесьці да кожнага калгасьніка адозву калгасьнікаў Капыльшчыны, якія высунулі сустрэчны плян здачы збожжа, і арганізацый Клімаўшчыны, якія абавязаліся да 14-ай гадавіны Кастрычніка выканаць гадавы плян загатовак.

З раду загатоўчых пунктаў паступаюць весткі аб дрэннай падрыхтоўцы да сустрэчы збожжа новага ўраджаю. З месц сыгналізуюць аб затрыманьні з прыёмкай збожжа ў сувязі з запазнай будаўніцтва складаў, недахватам мяшкоў, вагі і г. д.

Прарывы ў падрыхтоўцы тэхнічнай базы стваральна сур'ёзную пагрозу ў збожжазагатоўках. Трэба фарсаваць арганізацыю тэхнічнай базы.

Агульнымі намаганьнямі дабіцца рашучага ўзмацненьня тэмпаў збожжазагатовак і поўнага выкананьня жнівеньскага пляну.

Калгасьнікі рыхтуюць збожжа да здачы

### Калгасы—у авангардзе

**СЛУЦАК.** (Наш кар.). Слуцкае аддзяленьне «Саюзхлеба», да якога прымацаваны загатоўчы апарат Слуцкага і Чырвона-Слабодзкага раёнаў, выканала гадавы плян загатовак на 18 проц., а заданьне на жнівень—на 365 проц.; замест 73 тон збожжа здана 267 тон. Узорную здачу хлеба паказалі калгасы Чырвона-Слабодзкага раёну, якія ўжо перавыканалі месячнае заданьне ў 18 раз. Калгасы ўключыліся ў абвешчаны «Крестьянской газетой» конкурс па збожжазагатоўках і наладзілі збожжавы канвэер.

Кулакі ўсімі мерамі імкнуцца падарваць загатоўкі. 16 жніўня на склад «Саюзхлеба» **кулакі і заможнікі Ленінскага сельсавету прывезьлі зусім гнілое лёгкавае збожжа.** Кулакі разгортваюць шалёную агітацыю супроць збожжазагатовак.

Апарат Слуцкага аддзяленьня Саюзхлеба абвясьціў сябе ўдарным на час збожжазагатовак. Арганізаваны ўдарныя брыгады прыёмшчыкаў. Устаноўлены пасты на ссыпных пунктах. К.

ВУШАЧЫ. (НАШ КАР.). КАЛГАС «НОВЫ ШЛЯХ», САРАЧЫНСКАГА СЕЛЬСАВЕТУ, ПЕРШЫМ У РАЁНЕ СКОНЧЫЎ МАЛАЦЬБУ ЖЫТА І АДГУКНУЎСЯ НА ЗАКЛІК КАЛГАСЬНІКАЎ КАПЫЛЬШЧЫНЫ.

17 ЖНІЎНЯ Ў М. ВУШАЧЫ ПРЫБЫЎ ЧЫРВОНЫ АВОЗ З КАЛГАСУ «НОВЫ ШЛЯХ», ЯКІ БЫЎ СПАТКАНЫ ПРАДСТАЎНІКАМІ МЯСЦОВЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ. АДБЫЎСУ ЎРАЧЫСТЫ МІТЫНГ. ЗДАНА КААПЭРАЦЫІ 28 ЦЭНТН. ЖЫТА НОВАГА ЎРАДЖАЮ.

ШКЛОЎ. (ПА ТЭЛЕФОНУ). У ГОРАД ПРЫБЫЎ ВЯЛІКІ ЧЫРВОНЫ АВОЗ З КАЛГАСАЎ. ЗА АДЗІН ДЗЕНЬ ЗДАНА 502 ЦЭНТН. ЖЫТА, 15—АЎСА, 86—ЯЧМЕНЮ І Г. Д. УСЯГО ЗДАНА ЗБОЖЖА 604 ЦЭНТН. У ЧЫРВОНЫМ АВОЗЕ ПРЫМАЛІ ЎДЗЕЛ І АДНААСОБНЫЯ ВЯДНЯЦКА - СЕРАДНЯЦКІЯ ГАСПАДАРКІ, ЯКІЯ ЗДАЛІ 118 ЦЭНТН. ТЭХНІЧНЫХ КУЛЬТУР.

НА ССЫПНЫМ ПУНКЦЕ БЫЎ АРГАНІЗОВАН МІТЫНГ, НА ЯКІМ КАЛГАСЬНІКІ І БЕДНЯКІ І СЕРАДНЯКІ-АДНААСОБНІКІ ЗАПЭЎНІЛІ РАЁННЫ КАМІТЭТ ПАРТЫІ, ШТО ЯНЫ НЕ ПРАДАДУЦЬ НІВОДНАГА ЦЭНТНЭРА ЗБОЖЖА ПРЫВАТНІКУ І ПА-БАЛЬШАВІЦКУ ПРАВЯДУЦЬ ЗАГАТОЎЧУЮ КАМПАНЮ. М.

МЕНСКАЯ КАНФЭРЭНЦЫЯ ІТР

## НАГА Ў НАГУ З РАБОЧАЙ КЛЯСАЙ ЗМАГАЦЦА ЗА САЦЫЯЛІЗМ

Менская гарадзкая канфэрэнцыя ІТР, якая цягнулася два вечары, прайшла пад кутом праверкі таго, як рэалізуюцца прапановы, высунутыя прамоваю тав. Сталіна, пад кутом выкананьня канкрэтных мерапрыемстваў у далейшай рабоце на аснове гэтай прамовы.

Канфэрэнцыя прайшла гры вялікай актыўнасьці інжынэрна-тэхнічных работнікаў Менску.

Інжынэрна-тэхнічныя работнікі ў сваіх выступленьнях адзначылі гістарычную важнасьць указаньняў тав. Сталіна і выключную неабходнасьць перабудовы ўсёй работы на аснове гэтых указаньняў, як галоўнай умовы выкананьня вытворчых плянаў. Канфэрэнцыя мабілізавалася на масавае расьсьюджаньне тэхнічных ведаў сярод рабочых, на паширэньне рацыяналізатарскага руху і г. д.

Інжынэр заводу «Бальшавік» тав. Аксэльрод паведаміў канфэрэнцыі, як ІТР іхняга заводу практычна ажыцьцяўляюць указаньні тав. Сталіна.

— На заводзе,—кажа тав. Аксэльрод,—была вялікая цікучасьць рабочай сілы. Яна складала каля 42 проц. Прычынай цікучасьці была ўраўнілаўка ў заработнай плаце. Зараз па заводзе складзен і зацьверджан сьпіс вядучых прафэсій, па вядучых апэраціях павышан заработак рабочых. Групы вядучых работ жэлятынага цэху пераведзены на прэміяльную аплату з улікам ня толькі колькасных, але і якасных паказальнікаў. Некаторыя групы рабочых пераведзены з калектыўнай прэміяльнай аплаты на індывідуальную, а некаторыя на прагрэсыўную аплату.

Тав. **Золатаў, тав. Пушко** завастраюць увагу ІТР на неабходнасьці вузьняцьця сваёй палітычнай граматнасьці.

Тав. Золатаў ставіць пытаньне аб шырокім разгортваньні спаборніцтва і ўдарніцтва сярод ІТР.

Вялікую ўвагу зьвярнула канфэрэнцыя па пытаньні плянаваньня, складаньня кантрольных лічбаў на 1932 год і другую пяцігодку, правільнай расстаноўкі рабочай сілы, поўнага скарыстаньня мэханізмаў, укараненьня гаспадарчага разрахунку, ліквідаджаньня тэхнічнай вучобы на прадпрыемстве і інш.

На канфэрэнцыі выступілі з прамовамі сакратар гаркому КП(б)Б тав. **Кавальчук,** старшыня ВСНГБ тав. **Грысевіч** і члены прэзыдыуму ЦСПСБ т.т. **Камзиштэйн і Кавалёў.**

Канфэрэнцыя прыняла адозву да ўсіх ІТР Беларусі, у якой пералічаны канкрэтныя самазабавязацельствы, што бяруць на сябе ІТР гор. Менску па ажыцьцяўленьні прапаноў тав. Сталіна, па забесьпячэньні выкананьня вытворчых плянаў. Канфэрэнцыя выклікала на спаборніцтва ІТР Гомельшчыны, Віцебшчыны, Магілеўшчыны і Бабруйшчыны.

Канфэрэнцыя выбрала гарадзкое бюро ІТР з 30 чалавек, якому даручана вылучыць брыгаду на кантролі над рэалізацыяй прынятых самазабавязацельстваў.

ЗЬЛЁТ КАМЕНШЧЫКАЎ МЭНСКУ

## САЦЫЯЛІСТЫЧНЫЯ РЭКОРДЫ— ПЕРАТВАРЫЦЬ У ШТОДЗЕННЫЯ НОРМЫ

Менскія каменшчыкі **Дворкін, Лагуцін** — піянэры ўдарных тэмпаў цагельнай кладкі. Аб іх сусьветных рэкордах ведае ўжо ўвесь Савецкі Саюз.

У чым-жа сакрэт перамогі тав. **Дворкіна і Лагуціна?**

На агульна-гарадзкім зьлёце каменшчыкаў-ударнікаў, скліканы ЦП саюзу рабочых прамыслова-жыльлёвага будаўніцтва, газэтай «Рабочий» і дырэкцыяй усебеларускай будаўнічай выстаўкі — героі сацыялістычных рэкордаў падзяліліся вопытам сваёй работы.

Як вядома, каменшчык з Менбуду **Дворкін** за 3 гадзіны ўлажыў звыш 9.000 штук цэглы, што складае за 8-гадзінны рабочы дзень 24.000 цэглін. Такіх тэмпаў цагельнай кладкі дагэтуль ня ведалі. Малады каменшчык, камсамолец **Лагуцін** пры дапамозе 5 чорнарабочых за 5 гадз. 3 квіліны ўлажыў 10.964 штук цэглы.

Яшчэ раней добрыя прыклады работы паказалі **гомельскія** каменшчыкі, якія фактычна выступілі пачынальнікамі новых мэтадаў каменнай кладкі.

Посьпехі дасягнуты ў выціку аўладаньня тэхнікай кладкі і разгортваньня ўдарніцтва і спаборніцтва сярод каменшчыкаў. Аспоўнае ў новай тэхніцы каменнай кладкі — эканомія рухаў. Цэлы рад функцый каменшчыкаў, якія не патрабуюць высокай кваліфікацыі выконваюць чорнарабочыя, чым павышаецца прадукцыйнасьць каменшчыка на асноўнай рабоце на кладцы. Неабходнымі ўмовамі зьяўляюцца — рацыяналізацыя рабочага месца, знаходжаньня матар'ялаў, сыстэмы кладкі, падачы і транспартаваньня матар'ялаў.

У спрэчках прынялі ўдзел 10 каменшчыкаў-ударнікаў, у тым ліку т.т. **Дворкін, Лагуцін, Прыткоў, Гарнізэ,** а таксама некаторыя інжынэрна-тэхнічныя работнікі, гаспадарнікі і прафработнікі. Усе яны падкрэсьлілі магчымасьць здаць у архіў існуючыя дагэтуль па многіх пабудовах такія нізкія нормы кладкі, як 700-800 цаглін у зьмену. Пераход на новы рацыяналізатарскі мэтад кладкі з падзяленьнем працы ў значнай ступені пакрые дэфіцыт у каменшчыках, які назіраецца цяпер на многіх работах.

На жаль, менскія будаўнічыя арганізацыі да гэтага часу ня прынялі адпаведных практычных мер для ўкараненьня новых мэтадаў кладкі ў больш шырокім разьмеры. У прыватнасьці, вельмі слаба ўкараняецца жаночая праца.

У **Менску** ўсяго 2 брыгады каменшчыкаў — **Прыткова і Матушкова** перайшлі на работу па прынцыпе падзяленьня працы. Па брыгадзе **Прыткова** ўжо ёсьць першыя вынікі. Так, калі да пераходу па новы мэтад кладкі, каменшчык 5-та разраду ўкладваў 650-700 шт. цэглы, дык зараз, пры палучэньні пасобнага чорнарабочага, які падае раствор і цэглу на сьценку, гэты-ж каменшчык укладвае ўжо 2.000 штук.

Зьлёт вызначыў рад практычных мерапрыемстваў па пераходзе на новыя мэтады работы і разгортваньні сацспаборніцтва і ўдарніцтва сярод каменшчыкаў.

Каменшчыкі зьвярнуліся да інжынэрна-тэхнічных работнікаў з заклікам прынаць актыўны ўдзел у папулярызацыі тэхнічных ведаў і арганізацыі цыкл лекцый па каменнай кладцы.

Зьлёт заклікае ўсіх каменшчыкаў выкарыстаць вопыт **Дворкіна і Лагуціна** і перайсьці на новы мэтад працы.

У мэтах лепшага перанясеньня вопыту **Дворкіна і Лагуціна,** будзе выпушчана спэцыяльная брашура па гэтым пытаньні, а таксама кіно-фільм. Вызначаецца таксама група сацыялістычных інструктароў.

Зьлёт пастанавіў узяць на грамадзкі буксір каменную кладку пабудовы Дому Ўраду.

Каменшчыкі выклікалі на сацспаборніцтва цесьляроў Беларусі на сацыялістычныя рэкорды работы.

М. К.

БАРАЦЬБА ЗА ТОРФ

## Сушка і ўборка— рашаючыя зьвеньні

### ЗАВОД „ЧЫРВОНЫ ТАРФЯНІК“ выканаў сваё сэзоннае заданьне на 95,7 проц.

Здабыча торфу па БССР на 18 жніўня (у тонах)

| 15 ЖНІЎНЯ | 16 ЖНІЎНЯ | 17 ЖНІЎНЯ |
|---|---|---|
| 43,4 | 43,7 | 44,2 |

НА 18-ГА ЖНІЎНЯ ТАРФЯНАЯ ПРАМЫСЛОВАСЬЦЬ БССР ЗДАБЫЛА 309.776,9 ТОН ТОРФУ, ШТО СКЛАДАЕ 44,2 ПРОЦ. СЭЗОННАГА ПЛЯНУ.

У АВАНГАРДЗЕ БАРАЦЬБІТОЎ ЗА ПОЎНАЕ ВЫКАНАНЬНЕ Ў ВЫЗНАЧАНЫ ТЭРМІН СВАЯГО ПРАМФІНПЛЯНУ ПА-СТАРОМУ ІДЗЕ ЗАВОД «ЧЫРВОНЫ ТАРФЯНІК», ЯКІ НА 18-ГА ЖНІЎНЯ ДАЎ 95,7 ПРОЦ. СЭЗОННАЙ ПРАГРАМЫ.

ЗНАЧНУЮ РАБОТУ ПА ВЫКАНАНЬНІ ТАРФЯНОГА ПЛЯНУ ПАКАЗВАЮЦЬ ТОРФЗАВОДЫ «ЛЕНІНСКІ ШЛЯХ», ЯКІ ВЫКАНАЎ СЭЗОННАЕ ЗАДАНЬНЕ НА 83,3 ПРОЦ., «ЗАКРАШЫНСКІ МОХ» — 81,0 ПРОЦ., «НОВАЯ БЕЛАРУСЬ» — 72,6 ПРОЦ. І «БАЛЬШАВІК»—69 ПРОЦ.

ЗЛАЧЫННА АДСТАЮЦЬ ЗАВОДЫ «ВОЛЬНІЦА» — ДЗЕ ЗДАБЫТА НА 18 ЖНІЎНЯ 7,5 ТОН ТОРФУ, АБО 6,0 ПРОЦ СЭЗОННАГА ПЛЯНУ, «РЭМІЗАВА» — 7,0 ПРОЦ., «ЧЫРВОНАЯ БЕЛАРУСЬ» 7,7 ПРОЦ., «ВЯЛІКІ МОХ» — 9,2 ПРОЦ. І «СМАЛЯВІЧЫ»—25,8 ПРОЦ.

ЗНАЧНА ПАДЫГНУЎСЯ Ў ВЫКАНАНЬНІ СВАЯГО ПРАМФІНПЛЯНУ ТОРФАЗАВОД «СВАБОДА», ЯКІ НА 18 ЖНІЎНЯ ДАЎ 40 ПРОЦ. СЭЗОННАГА ЗАДАНЬНЯ.

БАЯВАЯ ЗАДАЧА ДНЯ — ФАРСАВАЦЬ МЭХАНІЗАВАНЫЯ СПОСАБЫ ТОРФАЗДАБЫЧЫ. ПЕРАКЛЮЧЫЦЬ АСНОЎНЫЯ СІЛЫ ТАРФЯНІКАЎ НА ФРОНТ СУШКІ І ЎБОРКІ ТАРФЯНЫХ ЦАГЛІН З ПАЛЕЎСЬЦІЛКІ, БО ПЛЯН СУШКІ ПА 22-Х ТОРФАЗАВОДАХ БЕЛТОРФУ ВЫКАНАН ПРЫБЛІЗНА НА 30 ПРОЦ.

## Ударная работа камсамольцаў

БАРЫСАЎ, 21. (Па тэлеграфу). Торфазавод «Чырвоны Кастрычнік» на 18 жніўня здабыў 13.955,4 тоны торфу, што складае 55,0 проц. сэзоннага пляну.

Такі ніскі процант выкананьня прамфінпляну тлумачыцца дрэннай арганізацыяй працы і слабым разгортваньнем мэтадаў сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва.

Камсамольская арганізацыя Новабарысава, абгаварваючы становішча на тарфяным фронце, прыняла рад практычных мерапрыемстваў па ўдзеле ў ліквідацыі прарываў на торфазаводах «Чырвоны кастрычнік» і «Камунар».

Кожны дзень па торфазаводы выходзіць на 30 і больш камсамольцаў і рабочай моладзі.

На заводзе «Чырвоны Кастрычнік» працуе 70 чал. студэнтаў - камсамольцаў трохмесячных і шасьцімесячных пакурсаў. На заводзе «Камунар» у поўным складзе працуе зясная школа.

Камсамольцы ф-кі «Пралетарская перамога» скарысталі свой адпачынак на працы на торфазаводзе «Чырвоны Кастрычнік».

Прыклад нова-барысаўскіх камсамольцаў павінны пасьледаваць усе арганізацыі камсамолу БССР.

## Прафсаюзы у адказе за посьпех АСЕНЬНЯ-ЗІМОВЫХ ПЕРАВОЗАК

Учора скончыў сваю работу 2-гі пленум ЦК белбюро чыгуначнікаў. Пленум падагуліў вынікі падрыхтаванасьці чыгуначнага транспарту БССР да асеньня-зімовых перавозак.

Пленум канстатаваў, што з боку прафсаюзных арганізацый буйнейшых раёнаў чыгункі была праўлена апартуністычная бязьдзейнасьць у пытаньнях падрыхтоўкі да асеньня-зімовых перавозак, што ў выніку прывяло да таго, што рад важнейшых рашаючых галін чыгуначнага транспарту да асеньня-зімовых перавозак не гатовы.

Раённыя і мясцовыя профарганізацыі чыгункі па-сапраўднаму не павярнуліся тварам да чыгуначнага транспарту, паноўнага не перабудаваліся ў адпаведнасьці з прамовай т. Сталіна. Уся работа па перабудове прафсаюзных радоў праведзена фармальна. Тэмпы работы прафсыяльных арганізацый не забясьпечылі выкананьня важнейшых дырэктыў партыі і ўраду па чыгуначным транспарце. Усё гэта прывяло да таго, што спэцыяльны аздаравіцельны рамонт паравозаў па ўсіх раёнах, за выключэньнем Гомельскага, ня выкананы. Толькі адзін ГОМЕЛЬСКІ раён выканаў раней тэрміну пляны спэцыяльнага рамонту паравозаў. Гомельскі раён прапусьціў 86 паравозаў праз спэцыяльны рамонт, замест 82, прадугледжаных планам. Па ВІЦЕБСКІМ вузьле на 1 жніўня засталіся 34 паравозы, не прапушчаныя праз спэцыяльны рамонт. Тое-ж становішча і па іншых вузлах.

Вытворчыя нарады на паравозах г. гэтага часу не разгарнулі сваёй работы. Трыкутнікі на калёсах у большасьці выпадкаў бязьдзейнічаюць, апошняе ніякага кіраўніцтва не атрымліваюць з боку вышэйшых партыйных і прафсыяльных арганізацый чыгункі.

Адсутнасьцю сапраўднай работы трыкутніку на паравозах, вытворчых нарад, адсутнасьцю належнага кіраўніцтва сацспаборніцтвам і ўдарніцтвам — толькі гэтым можна вытлумачыць блоцкі рост процанту хворых паравозаў. Напрыклад, па Жлобінскім вузьле процант хворых паравозаў у першую дэкаду жніўня дасягнуў 19,43 проц. пры норме ў 16, па Воршы—17,2 проц., замест плянавых 13,2 проц., па Віцебску—23,29 проц., супроць плянавых 18,3 проц і г. д.

Нізавыя прафсыяльныя зьвенні чыгункі да гэтага часу ня сталі на чале творчага энтузіязму рабочых-чыгуначнікаў, слаба кіруюць сацспаборніцтвам і ўдарніцтвам, да гэтага часу не зварачалі ніякай увагі на паляпшэньне культурна-бытавых умоў рабочых, амаль зусім не вялі барацьбы з калярэтыкамі фактамі зрыву спаранай язды і г. д.

Па ўсіх раёнах на сёньняшні дзень мясца масавы зрыў спаранай язды. Па ЖЛОБІНСКІМ раёне ў першай дэкадзе ліпеня было 131 выпадак зрыву спаранай язды, а ў другой дэкадзе—174 выпадкі.

Ня лепш стаіць справа з падрыхтоўкай вагоннага парку да асеньня-зімовых перавозак. Увесь час павялічваюцца выпадкі адчэпак вагонаў з прычыны гарэньня буксаў і тэхнічнай няспраўнасьці. Напрыклад, па адным толькі ВІЦЕБСКІМ раёне адчэпкі вагонаў дасягаюць у месяц па гарэньні буксаў каля 260 выпадкаў, па тэхнічнай няспраўнасьці каля 300 выпадкаў.

Будаўнічыя работы па зьмене шпалмастоў і будаўніцтве новых пуцей выканана прыблізна на 30-50 проц. Дэлегаты пленуму падсавалі рад прыкладаў ганебна нядбайных адносін гаспадарнікаў і прафсыяльных арганізацый у справе падрыхтоўкі чыгуначнага транспарту да надыходзячых асеньня-зімовых перавозак.

Пленум вызначыў рад канкрэтных мерапрыемстваў у напрамку безадкладнага выкананьня даных дырэктыў па прыладзеньні чыгуначнага транспарту ў балаву гатоўнасьць. Прафсыяльныя арганізацыі павінны зараз-жа мабілізаваць усіх чыгуначнікаў на рэалізацыю вызначаных пленумам мерапрыемстваў. Трэба тэрміново скончыць аздаравіцельны рамонт паравозаў, зьмяніць шпалы, падрыхтаваць пакгаўзы і г. д.

Пад кіраўніцтвам партыйных арганізацый чыгункі, транспарт павінен быць гатовым выканаць пляны перавозак у трэцім рашаючым годзе пяцігодкі.

Пленум Белбюро ЦК чыгуначнікаў

## Будаўніцтва скончана, а мантаж адкладваецца

ТАЛОЧЫН. Асноўныя будаўнічыя работы на Талочынскім ільназаводзе скончаны, але чамусьці Галоўленком алтэрмінаваў мантаж заводу да 15-га верасьня. У сувязі з гэтым прыдзецца ўтрымаць штат работнікаў, пакуль будуць атрыманы машыны.

На будаўніцтве не хапае яшчэ некаторых матар'ялаў, як толь, што не дамагчымасьці пакрыць вытворчы корпус. Не хапае гэты.

Белкаапсаюз зусім не аддае ўвагі забесьпячэньню рабочых, што выклікае цікучасьць рабсілы.

ГУТМАН.

ПЕР ДЗЮКЛО

## ЗА КРАТАМІ КАЗЭМАТАЎ

Востраў прыгожасьці, бацькаўшчыны «вэндэты» крывавай, з роду ў род помсты, дзікага пераажыку сярэднявечча. Бацькаўшчына імператара французскага Напалеона Банапарта і аднаго з сучасных імператараў Францыі Каці — фабрыканта парфумы і пудры, мільёнэра і дэпутата...

А на аднай з высокіх скал Корсікі — скал, аб якія з гневам разьбіваюцца хвалі Міжземнага мора, стаіць хмуры сярэднявяковы замак-казэмат.

Гэта «Кальві» — ваенная катарга. Гэта «Кальві», дзе сотні матросаў і салдат французкай арміі і флёту гінуць пад ударамі хлыстоў шагляднікаў, дзе ў дваццатым веку адбываюцца штодзённа і кожны час зьдзекі над чалавекам, над працоўным.

За «Кальві» цягнуцца вялікія і глыбокія карсіканскія балоты... У гэтых балотах шукаюць ратунку палонныкі «Кальві».

Цяжкае жыцьцё рабочага на капіталістычнай фабрыцы. Цяжкае жыцьцё бедняка-селяніна на «сваім» маленькім кавалачку зямлі. Падаткі душаць яго. Сусед намешчык душыць яго.

А страшэнны эканамічны крызіс, які лютуе цяпер ва ўсіх краінах капіталу, пераступіў ужо і межы «квітнеючай» Францыі. І пад ударамі гэтага эканамічнага крызісу жыцьцё французкага рабочага, жыцьцё французкага бедняка-селяніна стала яшчэ больш цяжкім, яшчэ больш пякотным.

Цяжка, душна ў капіталістычным пекле працоўнай моладзі. Няма для яе выхаду. Няма ратунку ад заводзкага пекла, ад беспрацоўя, ад голаду і галечы ў вёсцы і ў горадзе.

А тут прывабныя афішы на сьценах гарадзкіх управаў і паліцэйскіх камісарыятаў: паступайце матросамі, уступайце ў рады нацыянальнага флёту, маладыя людзі французкай рэспублікі. Вас чакаюць там далёкія вандраваньні і прыгоды, заморскія краіны, лёгкае і бястурботнае жыцьцё...

І моладзь ідзе. Ідзе, каб унікнуць капіталістычнага заводу, эксплёатацыі, голаду і беспрацоўя.

Што-ж яна знаходзіць там?

Расчараньне наступае зараз-жа пасьля падпісаньня кантракту, які на пяць год зьвязвае па руках і на нагах маладога рабочага і селяніна, які аддае яго поўнасьцю ва ўладу катаў у кашы і ў галёнах.

Ты хацеў унікнуць заводзкага пекла, капіталістычнай эксплёатацыі? Але на сучасным капіталістычным ваенным суд не эксплёатацыя чалавека ў шмат раз больш бязьлітасная, чым шавт на капіталістычнай фабрыцы. Тут пануе самая жорсткая і бяссэнсная дысцыпліна. Тут афіцэр — цар і бог, а матрос — раб і маўклівая рэч у руках начальніка. Тут квітнеюць вядзекі над асобаю прапоўнага, насьмешкі на іх, нават пабоі. Тут нярэдкі спробы з боку разбэшчаных да мазга касьцей кажандзіраў прымусіць маладых матросаў служыць іх агідным схільнасьцям... А тых, якія супраціўляюцца ўсім гэтым зьдзекам, тых, хто «парушае дысцыпліну», — тых чакаюць халодны карцэр, ланцугі, суд, катарга...

Вось чаму «Кальві», «Клерво» і іншыя месцы зьняволеньня — катаржныя турмы Брыянаў і Пуанкарэ — поўны матросамі, вось чаму ваенны суд у Тулёне, Шэрбургу і Брэсьце так часта засядае.

Сэржант — адзін з галоўных наглядальнікаў у «Кальві» — магчыма ніколькі ня лепшы і ня горшы за ўсіх іншых наглядальнікаў ваенных турмаў ва Францыі.

Праўда, ён заўсёды п'яны, яго цяжкая рука ахвотна гуляе па тварах зьняволеных, ён ахвотна за бутэльку віна прымушае ліпшы-час-другі працаваць на плянтацыях суседніх з «Кальві» памешчыкаў тых, каго ваенны суд накіроўвае на катаржныя работы. Але хто-ж з іншых наглядальнікаў гэтага ня робіць?

А само вышэйшае начальства катаржнай турмы «Кальві»? Ці яно не спакушае на працы зьняволеных, ці яно ня морыць голадам іх, ці яно не прымушае іх за 50 сантымаў удзень (5 капеек) працаваць дзесяць гадзін у суткі на плянтацыях розных Каці і іншых карсіканскіх магнатаў? А потым і гэтыя пяцісантымовыя 50 сантымаў ці яно не хавае сабе ў кішэню?

Не! Сэржант Рамонэт верны служка сваіх гаспадроў. Ордэны, якія вздабляюць яго шырокія грудзі, ён «сумленна» заслужыў.

Дык вось і 23-га сакавіка 1930 году — з чаго, уласна кажучы, усё пачалося?

Група з дзевяці чалавек зьняволеных матросаў пад камандай сэржанта Рамонэт была адпраўлена на работы да памешчыка Масоні. Па дарозе Рамонэт зьбіў палкай аднаго са зьняволеных — зьбіў за тое, што той ня досыць шпарка ішоў. Але ў «Кальві» так часта б'юць зьняволеных, што, бадай, і ня варта нават зварачаць на гэта ўвагу.

Паўдня працавалі матросы на плянтацыях доктара Масоні. А ў 12 гадзін разьлягліся на граве, каб адпачыць і закусіць.

— Гэй, вы там, даволі прахалодзіцца! — пачуўся раптам над імі п'яны голас. За работу!

— Але, дазвольце сэржант Рамонэт, — адважыўся пярэчыць нехта з матросаў. Нам належыць дзьве гадзіны на адпачынак... А цяпер яшчэ і дванаццаці няма.

— Не размаўляць! — грымець сэржант, выхватваючы рэвальвэр з кабура. Зараз-жа за работу... Інакш усіх перастрэляю!

(Як пасьля высьветлілася, памешчык абяцаў Рамонэту бутэльку віна за тое, каб матросы працавалі «пабайчэй»).

І вось тады ня вытрымалі больш зьдзекаў маладыя палонныкі «Кальві». Яны кідаюцца на Рамонэта, абязсброіваюць і зьбіваюць яго.

Барочацца назад у казэматы няма мэт чымасьці. Іх-ка там чакае халодны карцэр, суд, можа расстрэл... І карсіканскія балоты хаваюць ад прасьледваньняў у сваіх нетрах уцекачоў.

Праз некалькі тыдняў іх усіх пераловілі. Між іншым актыўны ўдзел у «палаваньні» на ўцекачоў прымаў і адзін з багатых рускіх бекгвардзейцаў — уласьнік вілы «Рэнуколі» на Корсіцы. Ён са стрэльбай у руках бегаў разам з французскімі жандарамі па балотах, вынюхваў, выглядваў... Варты занятак для выпнанага з межаў СССР клясавага ворага!

Гэта ён памылкова параніў у нагу жандара Брынтэра. А мясцовая буржуазная прэса і гэта «злачынства» ўмудрылася ўзваліць на галовы ўцекачоў.

І вось дзевяць маладых матросаў, стрэйшаму з іх дваццаць год і малодшаму ледзь мінула сямнаццаць, дзевяць пралетараў — нашых братоў на класе пралеталяў 5 жніўня перад тулёнскім ваенна-морскім судом.

У чым абвінавачваюць іх? У супраціўленьні «законнай» уладзе, у пабоях назальніка, ва ўцёках з месца зьняволеньня, у спробе забойства...

Суд зьвяліва слухае паказаньні тых, хто гаворыць супроць іх хто скарэцца патапіць маладых матросаў. Кат Рамонэт, жандар Брынтэр і іншыя ім падобныя — о! гэтыя людзі поўнасьцю вартыя давер'я тулёнскага ваенна-морскага трыбуналу.

А вось са сьведкамі абароны — ну, а гэтымі іншае абыходжаньне. Ці можна давяраць бунтарам-матросам, нешчаму адвакату Сядулю, старшыні французкай сэкцыі МОПР'у (чырвонай дапамогі), Пэчыту? Вядома, не. Вядома, такіх людзям нельга давяраць.

І старшыня суда энэргічна перапыняе сьведак абароны, перашкаджае ім гаварыць, зьдзекуецца над імі... А калі іх паказаньні западзта пераканаўча б'юць па выкадах абвінавачэньня, тады... зьяўляюцца жандары, якія сілай выганяюць такіх сьведак з залі суда. А аднаго з іх — матроса Жана Графа — проста з алі суда адвялі ў турму.

— Я ненавіджу ваш флёт і вашае афіцэрства, — крыкнуў Граф ваенным судзьдзям.

— Гэта не матросы павінны былі б сядзець на лаўцы падсудных, а вы, — заявіў са свайго боку прадстаўнік МОПР'у тав. Пэтыт, — а тыя, на чыёй віне загінула 150 салдат на ваенных манэўрах гэтага году.

Хто-ж яны, гэтыя «злачынцы», якіх судзіць ваенна-морскі трыбунал горада Тулёна? Грабежнікі з вялікіх дарог, п'яніцы, хуліганы? — Луці Эміле — у мінулым лёкай рэстарану, Лебэль Яўгені, — работнік бейні, Факуен Люі — маханік, Валенцін Рэнэ — рабочы, Фэрард П'ер — мэталіст, Хэурцін Жан, Паронні Рэнэ, Мэнлер П'ер і Форт Жан — рабочыя.

Як бачыце, усе рабочыя, усе пралетары. І ў гэтым у вачох буржуазнага ваеннага суда і заключаецца іх галоўнае злачынства.

Ня доўга раіўся ваенна-морскі трыбунал. І «імем французкага народу» ён прыгаварыў усіх дзевяць маладых пралетараў да 27 год катаржных работ.

«Правасудзьдзе» «торжествует». «Злачынцы» пакараны. Сэржант Рамонэт можа спакойна зьдзекавацца над зьняволенымі.

Спакойны можа быць і пан ваенны прокурор Гэнрах, які так «бліскуча» здолеў падтрымаць пытае белымі ніткамі абвінавачаньне. Яго кар'ера заблісьнечана.

— Мы ні аб чым не шкадуем, мы ня просім ніякай адвакат паблажлівасьці. — Сьмела ў сваім апошнім слове заявілі сваім «судзьдзям» маладыя матросы-пралетары.

Буржуазныя газэты як Корсікі, так і метраполіі трубяць перамогу.

«Прыгавар тулёнскага суда паслужыць грозным папярэджаньнем для ўсіх іншых бунтароў!» — піпчуць яны.

Але рабочая клясa Францыі, рабочая клясa Корсікі, як і рабочая клясa ўсяго сьвету, думае інакш.

Яна на баку дзевяці «злачынцаў» з «Кальві». Яна бачыць у іх барацьбітоў за лепшую будучыню працоўнага чалавецтва. Яна вітае іх.

Клясa супроць клясы! — гэты рэвалюцыйны лёзунг сначыўсь сваё яркае выяўленьне і ў тулёнскім ваенна-морскім судзе.

Але, магчыма, казэматы «Кальві» — выключэньне ў агульнай сыстэме французкіх ваенных турмаў, магчыма, у іншых турмах абносіны да вызьволеных матросаў і салдатаў больш гуманныя, больш людзкія?

Нічога падобнага.

Вось, напрыклад, цэнтральная катаржная ваенная турма «Клерво». Там таксама мораць голадам зьняволеных, там таксама ўсяляк зьдзекуюцца над імі. б'юць іх, тыдзнямі і месяцамі мучаць у «сакрэтках» — у цэмэнтаваных карцэрах глыбока пад зямлёй. А іншы раз на асабліва непаслухмяных надаюць на некалькі дзён усьміральныя рубашкі.

Дрэнна ў «К

# „ВЫНАХОДЗТВА“ ФАШЫСЦКІХ КАТАЎ

## СПЭЦЫЯЛЬНЫЯ КАМЭРЫ ДЛЯ КАТАВАНЬЯЎ РЭВАЛЮЦЫЯНЭРАЎ

## Мільёны працоўных БССР уздымаюць гнеўны голас пратэсту!


Год выдання—XV
№ 227 (4132)
СУБОТА 22 ЖНІЎНЯ 1931
Цана нумара 5 кап.
ВЫХОДЗІЦЬ БЕСЫПЕРАПЫННА

# Зьвязда

Орган ЦК Мен. Горкому Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

РЭДАКЦЫЯ І КАНТОРА
МЕНСК, САВЕЦКАЯ, 63.
Тэлефоны
рэдактар—6-27,—сакратар—16-74, партактар—13-80, прамысл.—13-80, сель. гасп.—6-19, мясц. інформ.—6-19, замеж. інформ.—6-19, начны рэдактар—6-42, міжнародная інформацыя—10-74, канторавыд.—3-81, адказ. абанент.—2-31


## ФАШЫСКІ УРАД УЗАКОНЬВАЕ

### масавае забойства палітзьняволеных

### НОВЫ ПАЛІЦЭЙСКІ ТУРЭМНЫ РЭГЛЯМАНТ УВОДЗІЦЦА З 1 КАСТРЫЧНІКА 1931 г.

Зараз увага мільёнаў працоўных БССР прыкавана да фашысцкай Польшчы, дзе 10.000 палітзьняволеных не на жыцьцё, а на сьмерць змагаюцца супроць наступленьня фашызму, супроць увядзеньня паліцэйска-дэфэнзыўнага рэгляманту,—т. зн. супроць страты ўсіх тых мізэрных прывілей, якія былі здабыты шляхам зацятай шматгадовай барацьбы на працягу многіх год.

Орган польскіх сацыял-фашыстаў «Роботнік» у № 291 так падае сутнасьць гэтага фашысцкага закону:

«17 жніўня апублікавана ў «Дзеньніку законаў» за подпісам прэзыдэнта рэспублікі распараджэньне міністра юстыцыі Міхалоўскага аб увядзеньні новага турэмнага рэгляманту.

Паводле гэтага закону, усе засуджаныя зьняволеныя падзяляюцца на ТРЫ КАТЭГОРЫІ: 1) ЗАСУДЖАНЫХ НА КАТАРЖНУЮ РАБОТУ; 2) ЗАСУДЖАНЫХ ДА ТУРМЫ, ЯКУЮ ЗАМЯНЯЕ ПАПРАЎЧЫ ДОМ; 3) ЗАСУДЖАНЫХ ДА ЗВЫЧАЙНАЙ ТУРМЫ.

Апрача гэтага, паводле новага рэгляманту прадбачаецца яшчэ наступныя катэгорыі зьняволеных: ЖАНОЧАЯ, НЯПОЎНАГАДОВЫХ — ДА 17 ГОД, СЬЛЕДЧЫХ І РЭЦЫДЫВІСТАЎ (ПРАФЭСЬЯНАЛЬНЫХ ЗЛОДЗЕЕЎ, БАНДЫТАЎ І Г. Д. РЭД.)».

Як відаць з гэтага паведамленьня польскіх сацыял-фашыстаў, якія ня менш жорстка чым урад фашысцкай дыктатуры распраўляліся і зараз распраўляюцца з рэвалюцыйнымі рабочымі і сялянамі,—палітычныя зусім не адрозьніваюцца ад крымінальных, больш таго нават сама казна палітычных зьняволеных выкрэсьлена з новага закону.

Далей сацыял-фашысцкі «Роботнік» падае, што паводле новага закону прадбачыцца яшчэ зьмяшэньне палітзьняволеных, калі гэта дазволяць мясцовыя ўмовы, «на два тыдні ў асобных «абсэрвацыйных камэрах». Закон гэты ўводзіцца ў жыцьцё з 1 кастрычніка 1931 году.

Што гэта за «абсэрвацыйныя камэры» і каго туды будуць садзіць—ня трэба вытлумачваць. Палітычныя зьняволеныя ўжо добра ведаюць, што гэта за камэры. Гэта камэры бязупынных маральных і фізычных катаваньняў. У гэтыя камэры фашысцкія каты будуць кідаць самых стойкіх, самых лепшых энэргічных рэвалюцыйных барацьбітоў з тым, каб або зламаць іх, або закатаваць насьмерць. Вопыт фізычных і маральных катаваньняў, які будзе праведзен у гэтых «спэцыяльных камэрах», фашысцкія каты будуць дастасоўваць пасьля і да рэшткі палітзьняволеных. Гэтыя два тыдні, ізаляцыі аб якіх успамінае фашысцкі «Роботнік» будуць заменены месяцамі—да таго часу, пакуль не пакончана будзе з ахвяраю.

Зараз па ўсёй фашысцкай Польшчы коціцца хваля галадовак супроць увядзеньня новага паліцэйска-дэфэнзыўнага рэгляманту, які прыраўноўвае палітзьняволеных да крымінальных. Зграя турэмных бандытаў па загаду зьверху ўжывае самыя тонкія і зьверскія мэтады катаваньняў, ня спыняючыся ні перад чым, абы толькі зламіць супраціўленьне рэвалюцыйных барацьбітоў.

Працоўныя масы БССР павінны рашуча выступіць у абарону сваіх братоў па клясе. Толькі рашучае выступленьне пралетараў Польшчы пры дзейным падтрыманьні пралетараў Савецкага Саюзу і ўсяго сьвету змогуць вырваць 10.000 палітзьняволеных—палонных капітала з рук азьвярэлых фашысцкіх катаў.

## СЯЛЯНСТВА ЗАХ. БЕЛАРУСІ АДМАЎЛЯЕЦЦА АД ШАРВАРКАЎ

### Сяляне ствараюць дружыны рэвалюцыйнай самаабароны

### Непакой сярод фашысцкіх колаў

БЭРЛІН, 16. Паводле паведамленьня з Варшавы, рух сэзонынікаў сельгасработных і працоўных сялян Заходняй Беларусі з ножным днём усё больш пагрыбляецца, выклікаючы сур'ёзны неспакой у польска-фашысцкіх колах. СЯЛЯНЕ МАСАМІ АДМАЎЛЯЮЦЦА ВЫХОДЗІЦЬ НА ТАК ЗВАНЫЯ ШАРВАРКАВЫЯ РАБОТЫ (прымусовыя работы па пракладцы дарог і інш.). АРГАНІЗУЮЦЦА ДРУЖЫНЫ РЭВАЛЮЦЫЙНАЙ САМААБАРОНЫ, якія аказваюць супраціўленьне жандармэрыі і ўрадавым чыноўнікам, пускаюць кулаком і памешчыкам «чырвонага пэўніка» і інш.

У вёсцы ГАННА сяляне, даведаўшыся, што памешчык мае на мэце высякаць лес, што знаходзіцца на вучастку, якім карыстаюцца сельскія абшчыны (галоўным чынам вадапой) усёй вёскай накіраваліся ў лес і высеклі яго. Выкліканая памешчыкам паліцыя прымушана была ўбрацца, а лес быў разьнесен па сялянскіх дварох. У ВЁСКАХ СТВАРАЮЦЦА КАМІТЭТЫ ЛА АРГАНІЗАЦЫІ АДПОРУ ГРАБЕЖНІЦТВУ БЯДНЯЦКІХ МАС ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ.

Аб разьмерах сялянскага руху Заходняй Беларусі можна ўжо судзіць па адным тым, што толькі ў Браслаўскім раёне дэманстрацыяй і сутычкамі з паліцыяй ахоплена 11 ВЁСАК.

Нават афіцыяльная прэсай прызнаецца што за апошнія месяцы ў вёсках Заходняй Беларусі зафіксавана 1.200 ПАЖАРАЎ. Няма чаго і гаварыць, што добрая палова іх — гэта падпалы гаспадарак кулакоў, памешчыкаў і вайсковых асаднікаў — ненавісных агентаў польскага фашызму на акупаваных беларускіх «крэсах».

Маса беднякоў, пазбаўленых зямлі, страхі над галавою і работы, кідае свае галодныя вёскі, уцякае ў лясы, дзе арганізуе ўзброеныя атрады, уступаючы ў барацьбу з карнымі паліцэйскімі атрадамі.

Нездавальненьне ў масах працоўнага сялянства прыкметна перакідваецца і ў армію, якая цесным чынам зьвязана з вёскай. Гэтымі днямі ў Карэліцкую гміну, дзе адбываліся сялянскія дэманстрацыі ў абарону СССР, на дапамогу паліцыі быў выкліканы уланскі полк. Увесь полк адмовіўся выступіць супроць сялян, частка салдат перайшла на бок дэманстрантаў. Прышлося выклікаць спэцыяльную частку, ЯКАЯ СПАЛІЛА НЕКАЛЬКІ ВЁСАК, СЯЛЯНСКУЮ ЖЫВЁЛУ РАЗГРАБІЛА, ЗВЫШ 150 ЧАЛАВЕК АРЫШТАВАЛА. (ТАСС.).

## Зьлёт рабочых 5 краін у Кёльне

### Супроць імпэрыялістычнай вайны, супроць галечы, за СССР“

### РЭВАЛЮЦЫЙНАЯ СУСТРЭЧА

БЭРЛІН, 19. 16 жніўня ў Кёльне адбылася сустрэча рэвалюцыйных рабочых Нямеччыны, Францыі, Галяндыі, Бэльгіі і Люксэмбургу.

Сустрэча, у якой прымалі ўдзел дзесяткі тысяч рабочых, праходзіла пад лёзунгам барацьбы супроць імпэрыялістычнай вайны. З вялікім дакладам выступіў правадыр рурскага пралетарыяту тав. Флёрын.

Зьлёт віталі прадстаўнікі кампартыі Францыі, Бэльгіі, Галяндыі і Люксэмбургу. Выступаўшыя ў спрэчках па дакладу дэлегаты паказвалі на падрыхтоўку капіталістамі новай вайны і заяўлялі аб сваёй гатоўнасьці змагацца супроць вайны ў абарону Савецкага Саюзу.

Рабочыя, якія сабраліся, абавязаліся змагацца супроць падрыхтоўкі імпэрыялістычнай вайны і мабілізаваць працоўных на барацьбу супроць галечы, скарачэньня зарплаты і адзіным рэвалюцыйным фронтам абараняць бацькаўшчыну працоўных усяго сьвету — СССР.

ЛІСТ З ЯПОНІІ

## У ЦІСКОХ ТЭРОРУ

Гісторыя 9-гадовага існаваньня японскай кампартыі прадстаўляе собою гісторыю чарговых пераследаваньняў і новых посьпехаў, гісторыю разьвіцьця ад сэкты інтэлігентаў да масава-палітычнай партыі рабочае клясы. Рэарганізацыя партыі на аснове ленінскіх прынцыпаў і на масавай базе выклікалі сур'ёзны непакой кіруючых кляс і гэта дало штуршок да новых рэпрэсій супроць партыі.

Першы ўдар быў нанесен партыі 15 сакавіка 1928 году, калі ўрад арыштаваў 1.500 рабочых, з якіх 483 былі прыцягнуты да суда па абвінавачаньні ў прыналежнасьці да кампартыі.

Пачынаючы з гэтага часу на авангард рабочае клясы Японіі бязупынна сыплюцца ўсё новыя рэпрэсіі. У другой палове 1928 году перад судом стала 48 камуністаў. У красавіку 1929 году іх лік узрос да 295, а ў 1930 годзе—да 461. У канцы 1930 году ў засьценках японскіх турмаў знаходзілася ў агульнай складанасьці 1.235 камуністаў.

Партыя, аднак, аправілася ад гэтых ударaў і ўзмацніла сваю работу. Гэта тлумачыцца як гераічнымі намаганьнямі партыі, так і пырокім размахам рэвалюцыйнай энэргіі японскага пралетарыяту. Трэба ўлічыць, што ў 1923 годзе было патрэбна каля двух год, пакуль партыя аправілася ад панесенага ёй удара—арышту 28 кіруючых работнікаў.

Цяпер упяршыню ў гісторыі Японіі нелегальная кампартыя паўстае перад рабочымі масамі ва ўвесь свой рост. Магутны масавы пратэст прымусіў урад нападзіць адкрыты і аб'яднаны суд над 280 камуністамі, арыштаваных у часе розных вобыскаў.

Першае судовае пасяджэньне, на якім разглядалася справа 44 арыштаваных партыйных кіраўнікоў, мела месца 25 чэрвеня ў акруговым судзе Токіё. Зьявілася 38 камуністаў, бо 5 былі хворыя, а адзін уцёк. У ліку арыштаваных — вядомы лідэр партыі Гакусама (былы член ВККІ), Токуда, Сігіура, Ішыкава, Набыяма (былы член Выканбюро Чырвонага Прафінтэрну) і інш.

Гэты працэс мае гістарычнае значэньне іменна таму, што ён дасьць магчымасьць партыі адкрыта выступіць перад масамі.

За дзень да судовага пасяджэньня быў арыштаваны рад камуністаў, што мела мэтай перашкодзіць наладжаньню дэманстрацый. Будынак суда ахоўвалі 260 паліцэйскіх і 20 жандараў, 5 аўтамабіляў, на якіх везьлі арыштаваных, ахоўваліся такой-жа колькасьцю паліцэйскіх аўтамабіляў.

Пасьля зачытаньня абвінавачвачага акту выступіў падсудны Гакусама. Ён падкрэсьліў, што выступае ад імя камуністычнай партыі, якая далучаецца да Камуністычнага Інтэрнацыяналу і ня мае нічога супольнага з выключанымі з ле рэ нэгатамі. Ён пратэставаў супроць нечалавечых адносін да палітзьняволеных, з якімі ўлады абходзяцца, як з крымінальнымі злачынцамі.

Далей ён заявіў: «Больш 30 камуністычных працэсаў мелі месца ў Японіі, але ні на адным з іх партыя ня мела магчымасьці адкрыта выступіць з растлумачэньнем прынцыпаў сваёй палітыкі.

Мы патрабуем ад суда бязумоўнай свабоды слова і дамагаемся, каб грамадзкасьці было дазволена прысутнічаць на нашым працэсе. У адваротным выпадку мы не зьяўляемся на судовыя пасяджэньні. Мы патрабуем таксама неадкладнага вызваленьня ўсіх палітычных зьняволеных».

Працэс, відавочна, будзе працягвацца паўгода.

Кампартыя і рэвалюцыйныя прафсаюзы пачалі шырокую масавую кампанію пратэсту супроць клясавага суда. На прадпрыемствах і на вуліцах сталі паширацца камуністычныя лятучкі, якія заклікаюць да пратэста.

Партыя асабліва настойвае на прыцягненьні грамадзкасьці, бо ёй добра вядомы прыёмы і мэтады японскага «правасудзьдзя». Характэрна, што ўжо на другі дзень працэсу, судзьдзі прабавалі выключыць грамадзкасьць, але гэта ім не ўдалося, не ўдалося з-за энэргічнага адпору. Але ва ўсякім выпадку слуханьне справы пры закрытых дзьвярох—толькі пытаньне часу.

С. МОДЗІ.

## УСЕБЕЛАРУСКАЯ НАРАДА РЭДАКТАРОЎ ГАЗЭТ ЖЫВЁЛАГАДОЎЧЫХ РАЁНАЎ

Пастановай Сакратарыяту ЦК КП(б)Б 29-га жніўня ў 12 гадз. дня у Малой Залі ЦК КП(б)Б Кульпропам ЦК склікаецца ўсебеларуская нарада рэдактароў раённых газэт жывёлагадоўчых раёнаў з удзелам прадстаўнікоў цэнтральных устаноў і арганізацый (жывёлагадоўчы сэктар ЦК КП(б)Б, НКЗБ, Калгасцэнтр, Малакоцэнтр і інш.).

**Павестка дня:**

1. Аб разгортваньні сацыялістычнай жывёлагадоўлі і задачы друку — (даклад. т. т. Масюкоў і Аўчыньнікаў).

2. Удзел друку ў папулярызацыі і ажыцьцяўленьні адозвы ЦК і СНК (справаздача цэнтральных газэт — «Калгасьнік Беларусі», «Орка», «Сельскагаспадарчы рабочы». Раённых газэт: «Ударнік Койданаўшчыны», «Калгасьнік Мазырччыны», «Калектывіст» (Уваравіцкі раён), «Ленінскі шлях» (Слуцкі раён), «Сталінскі прызыў» (Касьцюковіцкі раён), «Калгасная радыё-газэта» (Менск).

3. Аб штодзённых палявых пасьценгазэтах (Вержбаловіч).

На нарадзе абавязкова прысутнасьць усіх камуністаў-работнікаў цэнтральных газэт.

## Працягваем руку брацкай дапамогі!

### НА АБАРОНУ ЎЗЬНІКЛУ, ФАШЫСЦКІХ ЗАСЬЦЕНКАЎ!

Аб'яднаны сход беларускіх пісьменьніцкіх арганізацый разам з усесаюзным зьездам польскіх пралетарскіх пісьменьнікаў і рабочымі масамі гор. Менску, якія прысутнічалі на сходзе, рашуча пратэстуюць супроць нячуваных катаваньняў і зьдзекаў польскага фашызму над працоўнымі масамі і палітзьняволенымі Польшчы, Зах. Беларусі і Зах. Украіны.

Польскія каты барбарскімі мэтадамі катаваньня далёка пакінулі ззаду сярэднявяковых інквізытараў. Шляхам падпёнага тэрору фашысцкая ўлада імкнецца задушыць рэвалюцыйна-вызваленчы рух працоўных мас Зах. Беларусі і Зах. Украіны. Разгром і масавыя закрыцьці беларускіх школ, павешаньне члена ТВШ Фёдара Марчыка, нячуваныя гвалты ў Луцку, Пінску, Лукішках і Горадні — усё гэта сьведчыць, што польскі фашызм канае, што ён знаходзіцца ў агоніі.

Мы, пралетарскія рэвалюцыйныя пісьменьнікі, зьвяртаемся з заклікам да працоўных мас Польшчы, Зах. Беларусі, Зах. Украіны, цясьней згуртавацца пад сьцягам кампартыі і на наступленьне фашызму адказаць магутнымі ўдарамі.

Прэч крывавыя рукі ад зарубежных нашых братоў!

Няхай жыве КПП, КПЗБ і КПЗУ!

Прэзыдыум сходу: Бруно Ясенскі, Міхась Лынькоў, Прынц, Кавеленка, Сьвішч, Ізі Харык, В. Сташэўскі, Кузьма Чорны, Максім Лужанін, Мысьлінскі, Сьлівінскі, Тэадор Нэйман, Нядзьвецкі, Квіцінскі, П. Броўка, Маракоў.

***

— Весткі аб катаваньнях палітычных зьняволеных у турмах фашысцкай Польшчы замяжваюць кроў у жылах, — пішуць у рэзалюцыі пратэсту ўдзельнікі міжпрафсаюзнага сходу — рабочыя і служачыя Лепеля. Сход з абурэньнем пратэстуе супроць белага тэрору і забойстваў у турмах лепшых сыноў рабочай клясы і працоўнага сялянства.

У адказ крывавым катам Пілсудскага ўдзельнікі сходу абавязваюцца ўзмацніць работу МОПР'у, каб ні аднаго саюза ня было без ячэйкі МОПР'у — усе члены саюзаў у рады МОПР'у.

Рабочыя і служачыя гораду працягваюць брацкую руку дапамогі палонным фашызму, уносьць 2000 рублёў і выклікаюць калгаснікаў Лепельскага раёну.

Далоў белы тэрор!

Далоў фашысцкую дыктатуру падрыхтоўкі інтэрвэнцыі супроць СССР!

Няхай жыве Савецкая Польшча!

***

Ставячы перад сабою мэтаў фізычнага і маральнага зьнішчэньня палітзьняволеных — лепшых прадстаўнікоў рабочай клясы і працоўнага сялянства, азьвярэлыя фашысцкія каты дайшлі да самых дзікіх, утончаных мэтадаў катаваньня 10 тысяч палітзьняволеных.

Рабочыя, служачыя і тэхпэрсанал гарбарні імя Сталіна ў Магілеве заяўляюць рашучы пратэст супроць фізычнага зьнішчэньня ў засьценках белапанскай Польшчы лепшых прадстаўнікоў працоўных мас Польшчы.

Пралетары Польшчы, Зах. Беларусі, Зах. Украіны. Трымайце вышэй сьцяг барацьбы за зьнішчэньне капіталістычнай, эксплёататарскай сыстэмы! Узмацняйце штурм капіталістычнай цытадэлі!»

Мы з свайго боку абяцаем усю сваю працу аддаць для перамогі сацыялізму ва ўсім сьвеце для зьнішчэньня эксплёатацыі і прыгнечаньня шматмільённых мас працоўных.

Мы заклікаем рабочых усяго сьвету ўзьняць свой рашучы голас пратэсту супроць белага тэрору, які пануе ў белапанскай Польшчы.

У адказ паліцэйскім катам мы адлічаем 2 проц. свайго месячнага заработку для падтрыманьня палітзьняволеных і іх сем'яў.

Далоў фашызм!

Няхай жыве пралетарская рэвалюцыя!

Няхай жыве кампартыя Польшчы, Зах. Беларусі і Зах. Украіны!

***

Рабочыя і служачыя кардоннай фабрыкі імя Леніна (Пукавіцкага раёну) у рэзалюцыі пратэсту зазначаюць, што польскі фашызм безчалавечным барбарскім чынам зьнішчае ў турмах лепшых барацьбітоў - рэвалюцыянэраў. Фашысцкі тэрор у турмах зьяўляецца толькі зьвяном у агульнай падрыхтоўцы інтэрвэнцыі супроць СССР. Але дарэмна. Гнілому капіталу ніколі ні ўдасца спыніць пераможны ход рэвалюцыі.

Мы рабочыя і служачыя ўсе, як адзін, уступаем у рады МОПР'у і ўносім аднадзенны заработак на дапамогу палонным капіталу.

Няхай жыве кампартыя Польшчы!

Няхай жыве сусьветны Кастрычнік!

***

Хворыя Клінгарадка 1-га корпусу гань бяць фашысцкіх катаў і адначасова уносяць 31 р. 70 к. на дапамогу палонным капіталу.

Хворыя выклікаюць пасьледаваць іх прыкладу іншыя корпусы клінікі, а таксама мэдпэрсанал, працоўных і служачых усіх клінік і лекавыя ўстановы БССР.

***

Курсанты па падрыхтоўцы ў КУБ катагарычна пратэстуюць супроць нячуванага разгулу белафашысцкага тэрору ў турмах фашысцкай Польшчы. 10 тысяч палітзьняволеных кінуты ў каменныя мяшкі за сваю барацьбу супроць фашысцкай дыктатуры.

У адказ на тэрор у турмах курсанты уносяць 60 руб. і пастанавілі адпрацаваць адзін дзень у карысьць палітзьняволеных.

Курсанты выклікаюць курсы па падрыхтоўцы ў КУБ Менску, Гомелю і Віцебску.

Далоў падрыхтоўку інтэрвэнцыі супроць СССР!

***

Польскі фашызм у сваіх перадсьмяротных сударагах даходзіць да шаленства: 98 забітых, 8.800 параненых, 9.350 арыштаваных рэвалюцыйных рабочых і сялян, 219 палітычных працэсаў, па якіх 1397 рэвалюцыянэраў - пралетараў засуджана ў агульнай сумо на 3268 год катаргі, — вось вынікі панаваньня фашысцкай дыктатуры за адзін толькі мінулы год.

У апошні час у турмы фашысцкае Польшчы кінуты звыш 10 тысяч лепшых сыноў рабочай клясы і працоўнага сялянства, дзе фашызм імкнецца зьнішчыць іх маральна і фізычна. Разгул белага тэрору ў турмах знаходзіцца ў непасрэднай сувязі з падрыхтоўкай інтэрвэнцыі супроць СССР.

***

Рабочыя, служачыя, студэнты саўгасу «Падбярэзьзе» ўзьнімаюць рашучы голас пратэсту і адначасова ў знак салідарнасьці з працоўнымі масамі фашысцкай Польшчы пастанавілі адпрацаваць адзін дзень адпачынку ў карысьць МОПР'у.

Рэзалюцыі пратэсту супроць паходу Польшчы фашызму на жыцьцё палітзьняволеных паступаюць з усіх канцоў БССР. Так, рэзалюцыі пратэсту атрымана яшчэ ад калгаснікаў і аднавасобнікаў вёскі Шэйка, ад рабочых і служачых торфазаводу Міхановічы, ад агульнага сходу рабочых Бабруйскага мэханічнага заводу імя Варашылава і інш.

## Паведамленьні

23 ЖНІЎНЯ Ў 7 ГАДЗІН ВЕЧАРА Ў ПАМЯШКАНЬНІ РЭДАКЦЫІ «ЗЬВЯЗДЫ» (САВЕЦКАЯ 63, 3-ці ПАВЕРХ, ПАКОЙ № 5)

ЦП САЮЗУ КААПГАНДЛЮ, ГАРПРАФСАВЕТ І РЭДАКЦЫЯ «ЗЬВЯЗДЫ»

СКЛІКАЮЦЬ

НАРАДУ ПА ПЫТАНЬНІ АБ ЯКАСЬЦІ ПРАДУКЦЫІ ХЛЕБА.

НА НАРАДУ ВЫКЛІКАЮЦЦА НАСТУПНЫЯ ТАВАРЫШЫ: НІСЭНБАЎМ (БКС), КАЦ (ХЛЕБАЗАВОД), ГУРЭВІЧ (ЦП МУКАМОЛЬНІКАЎ), ШАРАЙ (ХЛЕБАЗАВОД), ФЭЙГІН (САЮЗХЛЕБ), ІЦКОВІЧ (155 КРАМА), ЛЕДВІЧ (ХЛЕБІНСПЭКЦЫЯ), ЛЮБЧАНСКІ (ПРАМХЛЕБ), ГРЫНВАЛЬД (ДХІ), І СТАРШЫНЯ ЗАЎКОМУ ЗАВОДУ ІМЯ ВАРАШЫЛАВА.

— ЦК КП(б)Б паведамляе, што ў г. Полацку будзе працаваць вызнаная ПТ ЦКК КП(б)Б, выклікаюцца наступныя т. т. На 26/VIII-31 г. Статуля Г., Лаўрыновіч А. А. (Вульскі раён), Агранаў С. Э. (зав «Труды»), Лоўкіс П. Я., Зубец Ф. І. Савіцкая (Расонскі р.), Маркаў А. Х. (Полацк), Манчынскі Ў. А. (м. Дрыса), Туркаў А. Р. (м. Вушачы), Балай Ю. Ф., Яловік С. А. (м. Вула), Бобрыкаў Я. (м. Вальшы), Гарэлік С. П. (ст. Баравуха), Касач Д. В. (Вальшы, с/г. кам Н. Зара), Каземячанка М. А. (Барковіцкі р.) Стрыжэнка Д. А. (Полацкі р.), Грэчкін А. І. (Дрысенскі р.), Ларыонаў (ст. Бобаль). На 27/VIII-31 г. Манухаў М. І., Барысевіч М. М. (Асьвейскі р.), Бычкоў І. І., Узкоў Н. В. (б. Ветрынскі р.), Марозаў П. В., Куксаў Е. І. (Расонскі р.), Провадо С. П., Гуськоў Я. С., Чэкан Р. Д. Хэсін Х. М. (Вульскі р.). Салдун П. Г., Гальчынскі (Боркавіцкі р.), Коршун М. А. (м. Ветрына), Калодпер В. М., Званноў Ц. М., Літвінаў Н. Х., Плацнік Р. (г. Полацк), Цырлін М. (Полацкі р.), Статут А. П., (м. Вула), Яўка выкліканых абавязкова, прыезд за свой кошт.

— Інстытут масавага завочнага навучаньня партактыву пры ЦК КП(б)Б даводзіць да ведама ўсіх завочнікаў, што навучальны год па завочным партнавучаньні пачынаецца я 15 верасьня 1931 г.

— Арґінстр. ЦК КП(б)Б прапануе тэрмінова зьявіцца ў ЦК т. Шынкевічу з былога Чарэйскага раёну. Арганізацыі, якія ведаюць месца знаходжэньня т. Шынкевіча, просьба паведаміць ЦК КП(б)Б.

СЬПІС ТАВАРЫШОЎ, ЯКІЯ НЕ ЗЬЯВІЛІСЯ НА НОВУЮ РАБОТУ У СУВЯЗІ З ЛІКВІДАЦЫЯЙ 23 РАЁНАЎ.

1. Белякоў — не зьявіўся на работу ў Дубровенскі раён з Чырвонапольскага; 2. Шапіра — у Дрысенскі раён з Расонскага; 3. Зуёнак — у Чашніцкі з Халапяніцкага; 4. Шэйкман — у Любанскі з Ветрынскага, 5. Мартынаў — у Жыткавіцкі з Чачэвіцкага; 6. Чаропка — у Жыткавіцкі з Каханоўскага; 7. Унепік — у Чэрвеньскі з Хоцімскага; 8. Шашкін — у Бягомльскі з Багушэўскага; 9. Булаўскі — у Бягомльскі з Вупацкага; 10 Казлоў — у Бягомльскі з Вульскага; 11. Абугаў—у Бягомльскі з Чарэйскага; 12. Аніхейчык — у Брагінскі з Юравіцкага; 13. Шайтураў — Брагінскі з Азарыцкага 15. Здрайкоўскі — у Капыльскі з Вулькаскага; 16 Лапін—у Капыльскі з Расьнянскага; 17. Лужкоў. — у Полацкі з Касьцюковіцкага; 18. Давыдаў — у Чачэрскі з Хоцімскага; 19. Ларчанка — у Мазырскі з Копыльскага; 20. Гладкі — у Глускі з Грэскага; 21. Шведаў — у Глускі з Ляднянскага; 22 Сяліцкі — у Пранойскі з Бешанковіцкага; 23 Андэрсон — у Пранойскі з Дрысенскага; 24 Сукала — у Талочынскі з Крупскага; 25. Шэмелес — у Тураўскі з Ляднянскага; 26. Карынкевіч — у Тураўскі з Межанскага; 27 Шленпікаў — у Воршу з Мазырскага; 28. Друтман — у Капыльскі з Копыскага; 29. Вашкевіч — у Жыткавіцкі з Боркавіцкага; 30. Качан—у Клічаўскі з Боркавіцкага. 31. Кавлоўскі — у Клічаўскі з Сьвісьцацкага.

Партколегія ЦКК КП(б)Б БССР прапануе вышэйпералічаных т. т. даць у 24 гадзіны тлумачэньне ў ПК ЦКК КП(б)Б прычыны невыкананьня пастановы ЦК КП(б)Б аб пераезьдзе на новае месца працы.

Сакратар ПК ЦКК КП(б)Б Рыскін.


КІНО „КУЛЬТУРА“
ад 22 жніўня
новы мастацкі ўсходні фільм
СЫН КРАІНЫ
у гал. ролях:—арт. Б. УВАНІЦКІ, У. ВІКУЛІН, У. БРОДЗКІ
ЗВЫШ ПРАГРАМЫ:
Часопіс БЕЛДЗЯРЖКІНО № 15
1. Зьлёт ударнікаў калгасных палёў.
2. Усебеларускі зьлёт піянэраў.
3. Камунальнае будаўніцтва Менску.
4. Лягеры Асоавіяхіму—школ у абароны (кіно-нарыс)
Пачатак сэансаў 7,8, 45, 10. 30.
Каса адчынена з 5 гадзін.

СПЕРМОКРЫН
Дзярж. інстытут экспэрыментальнай эндакрыналёгіі наркамаховы здароўя
Даводзіць і паказаньні да ўжываньня высылаецца па першым запатрабаваньні дармова.
Цана 1 фляк. 30 гр.—1 р. 60 к.
„ 1 фляк. 50 гр.—2 р. 90 к.
„ 1 кер. у ампул.—1 р. 60 к.
„ табл. 1 фл. 25 шт.—1 р. 25 к.
ПРОДАЖ ПА ЎСІХ АПТЭКАХ І МАГАЗЫНАХ САН. І ГІГІЁНЫ
Пры адсутнасьці ў магазынах, аптэках, заказы і задаткі накіроўваць—Масква, Москворецкая, 23, Гум.

Для здачы абвестак у газэту „ЗЬВЯЗДА“ званіце па тел. 7-81

Інстытут Савецкага Будаўніцтва і Права абвяшчае прыём на вечэрні факультэт на аддзяленьні: савецкага будаўніцтва, судова-адміністрацыйнае і рацыяналізацыі кіраўніцтва.
Умовы прыёму тыя-ж, што ўстаноўлены пры прыёме ў ВНУ. Заявы прымаюцца да 15 верасьня г. г. у канцылярыі і інстытуту: Менск, Універсытэцкі Гарадок, галоўны корпус, 3-ці паверх, пакой № 323.
Дырэкцыя.

МАШЫНІСТКА, якая добра ведае беларускую мову, шукае месца.
Адрас: вул. Карла Маркса, д. 43, кв. 29, А. В. Клочко.

СЁНЬНЯ, у 7 гадз. вечара, у дваре 2-й школы
АДБУДУЦЦА ЗАНЯТКІ
гарадзкога атраду Асоавіяхіму ІМЯ БЛЮХЭРА
ЛЎКА Ў ФОРМЕ АБАВЯЗКОВА

„Чырвоная Зорка“ — СОНЕЧНЫ ПАХОД. Звыш праграмы нов. амэрык. комэдыя ЧАРЛІ ЧАПЛІН
Кінатэатр „Пралетары“ — Выдатны бытавы фільм Парыскі шавец, звыш праграмы кіно-нарыс БДК № 13
„Юны Піянэр“ (будынак кіно „Культура“) — нашумеўш. фільм паводле раману ВОЙНІЧА ОВАД у галоўн. ролі НАТА ВАЧНАДЗЭ. Яйка Мсьцівец у гал. ролі НЯМЕЦКАЯ АЎЧАРКА „ТАСО“. Пачатак у 2 гадз. дня.
„СПАРТАК“ Пач. у 7, 9, 11 Каса—з 5 гадз. — КРЭСТ І МАУЗЭР. Драма ў 8 частках.

Да ведама клюбаў і драмгурткоў.
Гарнітурная і цырульня ДЧА і культ. ЦСПОБ
ПЕРАЙШЛІ ў недальнае кіраўніцтва Відовішчных прадпрыемстваў БССР і знаходзяцца ў памяшканьні Белдзяржтэатру (уваход з бульвару).
Адкрыты 12—6 г. Выхадныя дні: 5, 10, 15, 20, 25, 30.

ВІЦЕБСКІ індустрыяльна-педагагічны інстытут
паведамляе, што ПРЫЁМ ЗАЯЎ на хэміка-тэхналёгічнае і фізыка-тэхнічнае аддзяленьні
ПРАЦЯГНУТ ДА 15 ВЕРАСЬНЯ 1931 г.
Дырэктар індустрыяльна-педагагічнага інстытуту Каляда.

Гомельскі Тэхнікум Грамадзкага Харчаваньня Белкаапсаюзу
(Гомель, Ляшчынская, № 4)
абвяшчае асеньні прыём студэнтаў—на першы аскоўны курс у колькасьці—80 асоб і на падрыхтоўчы курс—60 асоб
Тэхнікум рыхтуе спэцыялістаў сярэдняй кваліфікацыі ў галіне грамадзкага харчаваньня (тэхнікаў-эканамістаў, хэмікаў-лябарантаў, тэхнікаў-тэхналёгаў і інш.), як для сэкцый грамхарчу, так і для прадпрыемстваў (фабрык-кухняў і буйных мэханізаваных сталовак).
На асноўны курс прымаюцца асобы, якія скончылі сямігодкі (ці маюць наогул веды за 7-годку) ва ўзросьце 17—30 год. Для нескончыўшых сямігодкі, або скончыўшых такія раней 1929 г. утварацца прыёмовыя іспыты.
На падрыхтоўчы курс прымаюцца асобы, якія маюць веды за 5—6 групп.
Прынятыя ў тэхнікум будуць забясьпечаны стыпэндыяй і інтэрнатам, як і ў іншых індустрыяльных тэхнікумах.
Асобы, жадаючыя паступіць ў тэхнікум, павінны падаць заяву з дакумантамі (згодна правіл прыёму ў тэхнікумы) па адрасе: Гомель, Ляшчынская вул. № 4, Тэхнікуму грамадзкага харчаваньня.
Заявы прымаюцца да 10 га верасьня 1931 г.
Сэктар кадраў Белкаапсаюзу.

МЕНСКАЕ АДДЗЯЛЕНЬНЕ ЎСЕСАЮЗНАГА ЭЛЕКТРАТЭХНІЧНАГА АБ'ЯДНАНЬНЯ «ВЭО» абвяшчае набор у ФАБЗАВУЧ на падрыхтоўцы кваліфікаваных электрамантажных рабочых.
Прымаюцца асобы, якія скончылі сямігодкі.
Заявы падаваць да 1 верасьня г. г. Менскому Аддзелу Кадраў (был. Бірка Працы)—рог Ленінскай і Універсытэцкай.

ПРЫЁМ ЗАЯЎ
ад асоб жадаючых паступіць у восень г. г.
у Беларускі Дзяржаўны Універсытэт (Фізмат і Хімфак),
у Менскі Дзенны Рабфак і Вышэйшы Беларускі Педінстытут
працягнут да 10-га верасьня г. г.
Іспыты адбудуцца з 16 па 19 верасьня, а заняткі з уной залічанымі ў склад студэнтаў памянёных вышэй навучальных устаноў пачнуцца з 1-га кастрычніка г. г.
ЧЛП Рэктар БДУ і дырэктар Педінстытуту Рудзіцкі.

КОШТ публікацыі аб згубе 1 дакуманту 1 р.



Менск, друкарня «Зьвязды»

Адказны рэдактар—С. БУДЗІНСКІ.

Галоўлітбел № 337.